ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА АКРУГКОМУ КП(б)Б, АКРВЫКАНКОМУ І АКРПРАФБЮРО.

КОШТ НОМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І АКРУЗЕ 5 КАП.

РЭДАКЦЫЯ Савецкая, 32. Тэлеф. штульбэр 72, рэдактара 2-05, ... 4-75.

Падпісная цана ў месяц 80 кап. Плата за абвесткі: За радок пэтыту . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . 40 кап. Пры шматразовым друкаваньні: скідка па згодзе.

Год выданьня 13-ты.

№133 Панядзелак, 9 чэрвеня 1930 г. №133

XIII зьезд ухваліў палітычную лінію і практычную работу ЦКК КП(б)Б

(Па тэлеграфу ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Учора на раніншні пасяджэньні працягваліся спрэчкі па дакладу ЦКК КП(б)Б. Выказаліся т.т.: Караленка, Сташэўскі, Юзьвін, Жолудзеў, Земцоў, Шафранскі, Канакоцін, Ляўкоў, Тамкоў, Батва, Зяленкоўскі, Бейлін, Курцін. З заключным праковым выступіў т. Калінін.

На дакладу аб рабоце ЦКК КП(б)Б вынесена наступную пастанову:

— Заслухаўшы справаздачны даклад т. Калініна, XIII зьезд КП(б)Б цалкам і поўнасьцю ухваляе палітычную лінію і практычную работу ЦКК КП(б)Б, якая поўнасьцю адпавядала генэральнай лініі нашай партыі.

На вячэрнім пасяджэньні зьезд заслухаў даклады тт. Бенека і Грысевіча аб выкананьні пяцігодкі па пляну прамысловасьці.

XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

ДАКЛАД тав. ТРЫЛІСЭРА

аб рабоце Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі Усесаюзнай Камуністычнай Партыі (б) *)

Таварышы, раней чым прыступіць да свайго даклада, дазвольце ад імя Цэнтральнай кантрольнай камісіі Усесаюзнай камуністычнай партыі бальшавікоў вітаць XIII зьезд Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі (аплёдысмэнты).

I. Уступ

Посьпехі нашай партыі за час ад XV зьезду перад вамі ўжо ў выстарчальнай ступені былі асьветлены у дакладзе ЦК УсеКП(б). Посьпехі гэтыя грандыёзныя. Дзякуючы правільнай генэральнай лініі, праводзімай нашым Ленінскім ЦК, дасягненьні рэвалюцыйнай практыкі нашай партыі нашчэнт разьбілі розныя апартуністычныя тэорыі правых і нашчэнт разьбілі контр-рэвалюцыйны трацкізм.

Мы зараз уступілі ў такую паласу разьвіцьця нашага сацыялістычнага будаўніцтва, калі саюз рабочае клясы і асноўных мас сялянства грунтуецца на новай аснове, на аснове разгортваньня нашай буйной сацыялістычнай прамысловасьці, саўгасаў—з аднаго боку і разьвіцьця калгаснага будаўніцтва, сацыялістычнай перабудову вёскі—з другога. Правільная лінія нашай партыі, якая цьвёрда праводзіцца нашым Цэнтральным Камітэтам, стварыла матар'яльныя ўмовы для вялікага гістарычнага павароту ад палітыкі выцісканьня і абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў да палітыкі рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты,—«ад палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва да палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы» у раёнах суцэльнай калектывізацыі. Новыя вытворчыя формы змычкі гораду і вёскі, напружаныя тэмпы разьвіцьця індустрыялізацыі СССР, замацаваньне посьпехаў і далейшы рост калгаснага будаўніцтва забясьпечваюць «стварэньне фундаманту сацыялістычнага грамадзтва» (тэзісы тав. Якаўлева), ствараюць «такую сувязь паміж горадам і вёскай, якая забясьпечвае перамогу сацыялізму» (Сталін). Гэтых вялізарных посьпехаў партыя дабілася ў рэзультаце жорсткага змаганьня за генэральную лінію, пасьлядоўнага, вытрыманага змаганьня супроць галоўнейшай небясьпекі для партыі правага ўхілу, супроць «левага» апартунізму, які ўзмацняе правую небясьпеку, і супроць прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. Шлях будаўніцтва сацыялізму ў нашым саюзе Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік—гэта не пагулянка па алеі раз, гэта шлях самага жорсткага, напружанага клясавага змаганьня з капіталістычнымі элемэнтамі унутры нашага Саюзу і капіталістычным сьветам вакол нашым Саюзам. Шаленую нянавісьць усяго капіталістычнага сьвету, шалёнае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў унутры нашага Саюзу выклікаюць кожны посьпех на фронце нашага сацыялістычнага будаўніцтва, кожны крок наперад у справе ўмацаваньня новых вытворчых форм змычкі пралетарыяту і асноўных мас сялянства. І гэта зразумела, бо нашы посьпехі—вярнейшая пагібель для ўсіх рэштак капіталізму ў нашым Саюзе і магутны ўдар па ўсёй сусьветнай капіталістычнай сыстэме. Але тым шырэй, глыбей мабілізуюцца пралетарская бядняцкія і серадняцкія масы вакол нашай партыі, выказваючы ёй паўнейшае давер'е і ўхваленьне яе ленінскай палітыкі. Усё гэта трэба мець на ўвазе, калі мы падыходзім да абмеркаваньня дзейнасьці Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі. Мы ведаем, што паводле Леніна: «галоўная задача нашага ЦК і ЦКК, як і нашай партыі ў цэлым, заключаецца ў тым, каб уважліва сачыць за абставінамі, з якіх можа ўзьнікнуць раскол і папярэдзіць іх бо ў апошнім рахунку лёс нашай рэспублікі будзе залежаць ад таго, ці пойдзе сялянская маса з рабочай клясай, захоўваючы вернасьць саюзу з ёй, ці яна дасьць «нэпманам», г. ё. новай буржуазіі, разьяднаць сябе з рабочымі, раскалоць сябе з імі».

Выходзячы з гэтай бясспрэчнай ленінскай установікі, ЦКК УсеКП(б) у сваёй рабоце за справаздачны пэрыяд ад XV зьезду, кіруючыся пастановамі партыі—XV зьезду, XVI канфэрэнцыі, пленумаў ЦК УсеКП(б), вяла рашучую няпрымірымую барацьбу за ленінскае адзінства радоў нашай партыі, барацьбу супроць ухілаў (правага—як галоўнейшай небясьпекі для партыі) ад генэральнай лініі, супроць прымірэнцтва, супроць апартунізму ў практычнай рабоце, супроць членаў партыі, якія разлажыліся, абюракраціліся, супроць парушальнікаў лёзунгу партыі аб разгортваньні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і рашучага разгортваньня самакрытыкі, супроць парушальнікаў партыйнай дысцыпліны і супроць усіх носьбітаў нездаровых зьявішчаў у нашай партыі, імкнучыся ў той-жа час ня толькі адсякаць шкодных для партыі членаў, але і выхоўваць парткадры, дапамагчы таварышу выправіць допушчаную ім памылку, калі ён яе зрабіў выпадкова. Разам з тым, ЦКК сканцэнтравала сваю дзейнасьць на дапамозе партыі ў справе зьнішчэньня «папярэджаньня» таго, што магло-б паслабіць саюз рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства, аддаючы выключную ўвагу і сілы стварэньню умоў, якія забясьпечылі-б ажыцьцяўленьне пастановы партыі аб тэмпах сацыялістычнага будаўніцтва, сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, аб выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну, аб укараненьні рацыяналізацыі ў работу гаспадарчых і савецкіх апаратаў і прадпрыемстваў, аб кадрах, аб патаненьні і спрашчэньні дзяржапарату, аб чыстцы партыі і чыстцы дзяржапарату і г. д., і т. п. Ва ўсёй сваёй разнастайнай рабоце ЦКК нязьменна апіралася на прыцягненьне да ўсіх відаў сваёй разнабаковай дзейнасьці шырокіх мас пралетарыяту, батрацтва, сялянскай беднаты і серадняцтва, выявіўшы і разьвіваючы новыя формы масавай работы—сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, шэфства прадпрыемстваў над установамі, лёгкай кавалерыі, камісій садзейства РСІ, ЦКК і г. д. і т. п.

Пасьля гэтых некалькіх агульных заўваг пяройдзем да характарыстыкі непасрэднай работы ЦКК РСІ.

II. Барацьба за адзінства і чыстату партыйных радоў

У галіне змаганьня за адзінства нашай партыі перад ЦКК стаялі тыя-ж задачы, якія стаяць перад усёй партыяй: гэта самае рашучае і няпрымірымае змаганьне на два франты. Змаганьне супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, галоўнай таму, што ўмацаваньне правага ўхілу азначала-б у пэрспэктыве разлажэньне дыктатуры пралетарыяту і аднаўленьне капіталістычнага рэжыму (гэта заўсёды трэба мець на ўвазе, калі мы гаворым аб правым ухіле і падкрэсьліваем галоўную яго небясьпеку); рашучае змаганьне супроць прымірэнцтва да правага ўхілу, супроць «левых» загібаў, якія, як мы ўсе пераканаліся на аснове «левых» перагібаў у калгасным будаўніцтве, зьяўляюцца спажыўным бульёнам і для правага ўхілу і змаганьне супроць прымірэнцтва да «левага» апартунізму. За бягучы пэрыяд ЦКК на аснове пастановы XV зьезду ачысьціла рады нашай партыі ад прыхільнікаў і ўдзельнікаў трацкісцкай апазыцыі, аб якой наўрад ці трэба шмат гаварыць на гэтым зьезьдзе пасьля таго, як контр-рэвалюцыйная яе існасьць была выкрыта перад усім пралетарыятам і нашым і сусьветным. Тут трэба адзначыць, што ня зважаючы на шум і гоман, узьняты ў свой час гэтай апазыцыяй, яна аказалася мізэрнай кучкай людзей, якая ня мела колькі-небудзь сур'ёзных караняў у нашай рабочай клясе. Увесь лік, прынамсі, выяўленых трацкістых, быў прыцягнуты кантрольнай камісіяй за фракцыйную дзейнасьць—6.485 чал. за увесь гэты пэрыяд. Заяў аб адыходзе ад апазыцыі, пачынаючы з XIV зьезду, была падана 4.350, г. зн. гэта трацкісцкая арганізацыя растайвала пад пякучымі праменьнямі посьпехаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва, растайвала як сьнег. Гэта група ў 4.350 чал. яна складаецца з адышоўшых, самастойна, не чакаючы сваіх правадыроў, элемэнтаў і складае дзьве трэці ўсёй групы трацкісцкай апазыцыі, прыцягнутых за ўдзел у апазыцыі. Адыйшлі ад трацкізму ў парадку далучэньня да заяў правадыроў (Радэк, Прэабражэнскі і інш.)—1.029 чал., усяго адышоўшых 82 проц. З каго-ж камплектаваліся, галоўным чынам, трацкісцкія рады? З групы у 3.384 чал. толькі 1.600 прыпадае на рабочых. З гэтай групы ў 1 600 чал. працуюць на вытворчасьці 858 чал., г. зн. да агульнага ліку рабочых у партыі гэта нават менш 1 проц., сялян—3,9 проц. з агульнай групы выключаных. Служачых і інш.—найбольшы процант—усяго 50 проц. Такім чынам, таварышы, тое, што так многа прыцягвала ў нас увагі, што так многа патрабавала ад нас работы, аказалася мізэрнай групай, якая пры першым дачыненьні з гэтай хваляй, якой была ахоплена ўся наша партыя супроць спроб трацкізму весьці змаганьне на вуліцах, разьляталася, як дым. І гэтыя рэзультаты знаходзяць сваё выстарчальнае завяршэньне ў тым, што галоўны натхніцель гэтай апазыцыі супроць ленінскай партыі—Троцкі, ён «на фоне няпрыкрытых клясавых адносін» капіталістычнага сьвету, на тэрыторыі якога ён знаходзіцца, супрацоўнічае ў буржуазнай прэсе, ён кучецца з сацыял фашыстамі і выступае разам з тымі, якія вядуць цкаваньне супроць нашай партыі і савецкай улады, канчаткова згубіўшы свае былыя заслугі ўдзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі, як барацьбіт за Кастрычніцкую рэвалюцыю назаўсёды зышоў з гістарычнай авансцэны, утануўшы ў балоце. Між рэштак трацкістых, якія засталіся «вернымі» контррэвалюцыйнаму сьцягу, прабуюць скарыстаць труднасьці нашай вялікай будоўлі, каб падарваць давер'е мас да нашай партыі. Само сабою зразумела, што вызваленьне нашай партыі ад трацкісцкага сэктару не магло ня ўнесьці аздараўленьня ў партыю. Само змаганьне з трацкізмам нясумненна прывяло да таго, што наша партыя ідэйна яшчэ больш узмацнела. У змаганьні з трацкізмам наша партыя вырасла і тэарытычна, як усёды яна вырасла пры ўсякім ідэйным змаганьні з адыходамі ад лініі партыі, ад лініі ленінізму.

У парадку сваёй бягучай работы змаганьне супроць нездаровых зьявішч за справаздачны пэрыяд нашых кантрольных камісій была нясумненна ўзмацнёна параўнальна з ранейшым. І гэта зразумела, за тое жорсткае клясавае змаганьне, якое ўвесь час нарастала і нарастае далей у меру посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, абстаноўка абвостранага клясавага змаганьня з замежнымі ворагамі нашага Саюзу прад'яўляла і прад'яўляе членам партыі выключныя патрабаваньні, прад'яўлялі да баяздольнасьці нашай партыі павышаныя патрабаваньні, і гэта не магло не адбіцца на падыходзе ў рабоце нашых кантрольных камісій.

Мы маем з 1 студзеня 1928 г. па 1 ліпеня 1929 г. прыцягнутых па кантрольных камісіях па розных прычынах 102.759 чалавек, у адносінах да агульнае колькасьці членаў гэта складае нямнога больш 7 проц. Калі бліжэй прыглядзішся да колькасьці членаў партыі, якія прыцягваюцца па розных справах кантрольнымі камісіямі, то мы няўхільна прыходзім да такога вываду, для нас, праўда, ня новага, што найбольш здаровым сэктарам у нашай партыі зьяўляецца рабочы сэктар. Гэта відаць з таго, што сярод прыцягнутых па розных справах нашымі кантрольнымі камісіямі, процант рабочых з году ў год зьніжаецца. У 1926—27 г. процант рабочых з усяго ліку прыцягнутых раўняўся 6,7, у 1927—28 г. ён раўняўся ўжо 5,2 проц. у той час, як лік служачых сярод прыцягнутых нашымі кантрольнымі камісіямі некалькі павялічыўся: у 1926—27 г. 10 проц., а за 1927—28 г. гэты процант раўняецца 11.

З агульнага ліку зарэгістраваных прыцягнутых выключана было 34.104 чал. Гэта лічба не абыймае таго ліку выключаных, які ішоў па лініі змаганьня з трацкісцкай апазыцыяй, таксама, як гэтая лічба не ўключае і тых, якія былі выключаны пры чыстцы нашай партыі, аб чым будзе гутарка ніжэй. 34.104 чал.—гэта лічба ўсё-жа такі большая за тую, якую мы мелі ў мінулым годзе.

Калі параўнаць па паўгодзьдзям, будзем мець такі працэс нарастаньня прыцягнутых кантрольнай камісіяй: за 1-е паўгодзьдзе 1928 г. было прыцягнута 32,4 проц. членаў партыі, за 1-е паўгодзьдзе 1929 г. гэта колькасьць узрастае да 41%.

На што-ж галоўным чынам рабілі ўпор нашы кантрольныя камісіі пры выключэньні членаў партыі, якія праявілі сябе ў нездаровых зьявішчах. Мяркуючы па даных, якія ёсьць у цэнтральнай кантрольнай камісіі, упор быў на наступныя віды праступкаў і злачынстваў: калі за першае паўгодзьдзе 1928 г. з агульнага ліку выключаных за 1928 г. на групы растрат і пакраж прыпадае 79,3 проц., дык за першае паўгодзьдзе 1929 г. на гэту групу прыпадае больш высокі процант—87,6 проц., г. зн. узмацнёна было змаганьне з такога роду іменна злачынствамі.

Хабары і іншыя пасадавыя злачынствы за першае паўгодзьдзе 1928 г. з агульнага проценту выключаных—54,9 проц.—на гэту групу выключаных за першае паўгодзьдзе 1929 г. прыпадае 77,2 проц.

За скарыстаньне партыі ў асабістых мэтах 49 проц. у 1926 г. і 63 проц. за першае паўгодзьдзе 1929 г.

За сувязь з чужым элемэнтам у 1928 г.—42 проц., за першае паўгодзьдзе 64 проц. і 64 проц. у гэтым годзе. На гэту групу трэба зьвярнуць увагу.

Барацьба нашай партыі з тымі яе членамі, якія падтрымліваюць сувязь з чужымі элемэнтамі, была ўзмацнёна і ўзмацнёна па гэтай групе на 22 проц. За бюракратызм (з агульнага ліку выключаных) было выключана за першае паўгодзьдзе 1928 г. 4,3 проц., за першае паўгодзьдзе 1929 г.—14,2 проц., за пратэкцыянізм за першае паўгодзьдзе 1928 г.—7 проц., за першае паўгодзьдзе 1929 г.—16,8 проц., за гасабрастаньне і спэкуляцыю за першае паўгодзьдзе 1928 г.—52,4 проц., а за першае паўгодзьдзе 1929 г.—65,8% і г. д.

Зразумела, таварышы, трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на гэта лічбовае адлюстраваньне колькасьці бясчынстваў, якія члены партыі яшчэ робяць. Але намаганьнямі ўсёй партыі, якая падтрымліваецца ў гэтых адносінах рабочай клясай і працоўнымі, мы дабіваемся таго, што з радоў партыі выганяць усё чужое, усё тое, што здольна разлагаць партыю знутры і партыя з кожным годам робіцца ўсё больш здаровай цяпер, больш чым калі-небудзь раней. Змагацца з нездаровымі зьявішчамі ў партыі дапамагаюць нам ня толькі члены партыі, але і шырокія беспартыйныя масы рабочых, а за апошні час і сялянская бедната.

Тут трэба адзначыць, што намаганьні партыі, накіраваныя да таго, каб арабочыць самы склад нашай партыі, зьяўляюцца адным з найбольш верных спосабаў аздараўленьня нашай партыі. Рабочы сэктар—ён зьяўляецца, і не выпадкова зьяўляецца, найбольш здаровым сэктарам у нашай партыі, аздараўляюча ўплывае на ўсе астатнія праслойкі ў нашай партыі. У практыцы нашых кантрольных камісій бываюць выпадкі няправільнага падыходу, бываюць, калі хочаце, свайго роду перагібы, надта жорсткі падыход і іменна там, дзе здавалася-б ня месца яму, але ў асноўным лінія мясцовых кантрольных камісій зразумела, правільная, яна сканцэнтроўвае свой агонь па найбольш небясьпечных у сэнсе магчымасьці разлажэньня радоў нашай партыі нездаровых зьявішчаў. Нас часамі месцы папракаюць у другой крайнасьці, што мы назанадта часта скасоўваем пастановы мясцовых кантрольных камісій. Было-б няправільна, калі-б член партыі, беспадстаўна выключаны або атрымаўшы вымову, ня меў бы месца, куды-б ён мог пайсьці апэляваць, дабівацца аднаўленьня, правільнага палажэньня.

Калі на мясцох выключаюць, скажам, жанчыну-батрачку чырвонаармейку за сувязь з папом, калі пры бліжэйшым расьследваньні справы аказваецца, што гэта сувязь заключалася толькі ў тым, што гэта жанчына-батрачка купляла часамі малако ў папа, бо ў папа былі каровы, дык згадзецеся, што выключэньне за гэта з партыі нікуды ня годнае. Падобных выпадкаў у нас у практыцы ня мала.

Але ў асноўным работа нашых кантрольных камісій была правільнай. Агонь змаганьня быў накіраваны па правільных мішэнях і сіла ўдару таксама ў большай сваёй частцы была накіравана па правільным шляху.

Гэта мы бачым з таго, што колькасьць скасаваньняў пастаноў мясцовых кантрольных камісій з году ў год зьніжаецца: калі мы ў 1925 г. скасавалі 44 проц. па паданых апэляцыях, дык у 1926—27 г. ужо 36,7 проц., а за 1928—29 г.—толькі 24 проц. За 8 месяцаў (з 1-га мая 1929 г. па 1-га студзеня 1930 г.) разгледжана 13.286 спраў. З гэтае колькасьці спраў апэляцый па чыстцы партыі было ўсяго 1156 апэляцый на пастановы мясцовых кантрольных камісій... 60 проц. усіх апэляцый і, нарэшце, справы, якія ўжо ўзьнікаюць у самой ЦКК,—гэта па аднаўленьні партыйнага статуту і г. д. у колькасьці 27 проц. Значыць, найбольшая колькасьць спраў, якія разглядаюцца ў ЦКК, прыпадае на апэляцыі па справах мясцовых кантрольных камісій.

III. Генэральная праверка і чыстка партыі

Перайду да пытаньня аб чыстцы радоў нашай партыі. Чыстка нашай партыі на гэты раз, у адзнаку ад чысткі 21-га году, адзначалася нязвычайным размахам удзелу шырокіх рабоча-сялянскіх мас. У чыстцы нашай партыі, не гаворачы ўжо аб тым, што ўся наша мільённая партыя была мабілізавана, як адзін чалавек, прымала ўдзел каля 10 млн. рабочых, батракоў, беднякоў і пэўнай часткі серадпякоў.

Каля 10 млн. рабочых, батракоў і беднякоў чысьцілі нашу партыю, г. зн. лічылі, што справа аздараўленьня камуністычнай партыі зьяўляецца іх справай. Чыстка праходзіла ў атмасфэры нарастаючага давер'я да партыі, шырокіх мас рабочае клясы і бядняцка-батрацкіх мас у вёсцы. Партыя зьявілася як, быццам бы, родным дзецішчам гэтых мас. Гэты масы надзвычайна беражліва да гэтага дзецішча адносяцца, і трэба сказаць, што дапамога гэтых шырокіх мас такава, што яе цяжка недаацаніць.

У праверачныя камісіі была ўцягнута найбольш выпрабаваная частка партыі. Склад праверкомаў павінен быў забясьпечыць правільную лінію чысткі. Мы мелі ў складзе праверкомаў 42 проц. членаў ня ніжэй чым з 10-гадовым партыйным стажам і 12,7 проц., амаль 13 проц. падпольшчыкаў.

Якавы-ж вынікі чысткі нашай партыі? Што сабой прадстаўляе твар кіруючых кадраў нашай партыі? Як вы ведаеце, за выключэньнем Цэнтральнага Камітэту партыі і Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі, якія былі выбраны Ўсесаюзным Зьездам, усе іншыя кіруючыя арганізацыі падлягалі чыстцы на агульных падставах. Вось які мы тут маем малюнак. З праверанах 97 проц. членаў цэнтральных камітэтаў нацыянальных кампартый—партыйным спагнаньням падлягала 2,5 проц. членаў цэнтральных кантрольных камісій нацыянальных кампартый з 99 проц. амаль 100 проц. правераных партыйнам спагнаньню падлягаў 1 проц. Старшыні абласных, краявых і акруговых кантрольных камісій з 94 проц. партыйных спагнаньняў атрымалі 5,5 проц., а выключана 0,6 проц. Ваенныя і партыйныя калегіі з 93,6 проц. партыйным спагнаньням падлягала 5,6 проц., а выключана 0,8 проц.

Рэвізійныя камісіі, з 92 проц. правераных спагнаньню падлягала 5,7 проц., выключана 1,5 проц.

Пленумы абласных, краявых і акруговых кантрольных камісій з праверанах 92,5 проц., партыйнаму спагнаньню падпала 6 проц., а выключана 1,4 проц. Члены партыйных калегій з праверанах 91,9 проц. партыйнаму спагнаньню 6,6 проц., а выключана 0,74 проц.

Пленумы краявых, абласных, акруговых партыйных калегій, з праверанах 97 проц. партыйнаму спагнаньню падлягала 7,5 проц., а выключана 1,7 проц. і г. д.

Усё жа нягледзячы на тое, што ў кіруючых нашых партыйных органах у асобных выпадках аказаліся элементы, якім з партыяй не па дарозе, але ў пераважнай сваёй большасьці трэба лічыць, што партыя, наша партыйная маса падбірае свае кіруючыя органы ня дрэнна. Лепшая частка партыі выбіраецца нашымі таварышамі ў кіраўніцтва партыяй.

Што датычыць радавых членаў партыі, то тут мы маем такое становішча, даныя не зьяўляюцца вычэрпваючымі. Гэтыя даныя закранаюць толькі 1.123.000 чал., якія прайшлі чыстку. З гэтае колькасьці выключана 116.833 чал., г. зн. 10 проц. У параўнаньні з процантам выключаных у чыстцы 1921 году гэта лічба значна меншая. Чыстка 21-га году прывяла да выключэньня 30,3 проц., г. зн. амаль 1/3 членаў партыі. Ці значыць гэта, што мы на гэты раз чысьцілі слабей, чым у 21 годзе? Ні ў якім выпадку гэта ня значыць. Наадварот, у 1921 г. мы ня мелі такога становішча, калі-б у чыстцы партыі прымалі ўдзел такія шырокія масы беспартыйных рабочых і сялян. А гэта дапамога мас была вельмі істотна. Тлумачыць меншы процант выключаных у чыстцы 29—30 году больш мягкім падыходам ніяк не прыходзіцца. Меншы процант выключаных у гэтай апошняй генэральнай чыстцы, якая адбывалася на вачох і пры ўдзеле шырокіх мас беспартыйных рабочых і сялян, гэта гаворыць аб тым, што партыя наша становіцца з кожным годам усё больш здаровай і гэты вынік нікому ня трэба замазваць. З гэтым вынікам партыя ідзе да XVI зьезду.

За што галоўным чынам выключаліся? З выяўленых чужых элемэнтаў—15 проц., праявіўшых сябе, як сыстэматычна парушыўшых дысцыпліну партыі—20 проц., злачынных элемэнтаў—16 проц., за пасыўнасьць—17,1 проц. (вельмі значны процант). За бытавыя злачынствы і інш.—22,9 проц. Апрача выключэньня праверкомы шырока ўжывалі і выхаваўчыя меры ўзьдзеяньня ў выглядзе тых, ці іншых рэпрэсій. Пры чыстцы атрымалі спагнаньні да 136295 чал. Гэта ў адносінах да ўсёй колькасьці членаў, якія прайшлі чыстку—13,2 проц. Хто-ж галоўным чынам выключаўся? Калі параўнаць розныя сэктары нашай партыі, рабочых, сялян і служачых, то малюнак такі: рабочых паводле палажэньня з агульнае колькасьці выключаных—7,1 проц., сялян—15,5%, служ.—10,9%, г. зн. рабочы сэктар і тут аказаўся найбольш здаровым, ён даў найменшы процант выключаных.

У агульнай сыстэме нашых партыйных арганізацый найбольш слабым зьвяном зьяўляюцца вясковыя арганізацыі, і гэта характарыстыка вясковых арганізацый дала сябе адчуць у час практыкі «левых» перагібаў. Калі-б мы мелі на мясцох у вёсцы мацнейшую партыйную арганізацыю, то можна думаць, што і па колькасьці і па характары тыя перагібы, якія мелі месца ў калгасным будаўніцтве, былі-бы праяўлены ў значна меншаў меры. Гэта не падлягае ніякаму сумненьню. Адсюль трэба зрабіць вывад, што трэба будзе зьвярнуць асабліва сур'ёзную ўвагу на нашы вясковыя ячэйкі.

Што датычыць чырвонаармейскіх ячэек, то трэба сказаць, што чырвонаармейскія ячэйкі аказаліся адным з найбольш здаровых. Тут выключаных, у параўнаньні з іншымі выяўляецца ўсяго 5 проц. Што датычыць вузаўскіх ячэек, то яны таксама прадстаўляюць здаровы сэктар партыі, і гэта зусім натуральна бо Вузы камплектуюцца, галоўным чынам, з рабочых. Па вузаўскіх ячэйках процант выключаных выяўляецца ў 5,2 проц. Сацыяльны склад наступны: рабочых—51,7 проц., сялян—22,5 проц., служачых—25,8 проц.

IV. На фронце разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі

Гаворачы аб выніках чысткі партыі, я не ўпамянуў аб тэй выключнай і станоўчай ролі, якую адыграла разьвіцьцё самакрытыкі, што шырока разгарнулася ў часе чысткі. Тут трэба адзначыць, што з моманту, калі Цэнтральны Камітэт партыі зьвярнуўся з вядомай вам адозвай да ўсіх членаў партыі аб разгортваньні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, аб самым рашучым разьвіцьці пралетарскай самакрытыкі: зьнізу да верху і зьверху да нізу, не зважаючы на асобы. З таго часу мы, бязумоўна, у справе ўкараненьня самакрытыкі ў нашай штодзённай практыцы маем вялізарныя дасягненьні. Мы часта самі не заўважваем гэтай сапраўды шырока разгорнутай самакрытыкі. Сапраўды, разгарнеце любы нумар любой газэты, штодзень у кожным нумары самым добрасумленным чынам мы адкрываем усе вузкія месцы на ўсіх вучастках нашай работы, самым добрасумленным чынам мы выкрываем усе хваравітыя зьявішчы, якія ёсьць у нас у партыі, або на асобных вучастках нашай разнастайнай работы. Гэта ўжо настолькі ўвайшло ў прывычку, што мы нават не заўважваем гэтага і працягваем часамі ахвотна крычаць з повіаду таго, што ў нас самакрытыка недаволі разгорнута.

Я не хачу сказаць, што мы маем такое становішча, калі мы дасягнулі ў гэтых адносінах ідэалу, але ўсякія наскокі на партыю, усякія папрокі нашай партыі, нашаму кіраўніцтву ў тым, што яно недаволі клапаціцца, ня маюць ніякіх падстаў. Сама генэральная чыстка нашай партыі была найвялікшым актам шырока разгорнутай самакрытыкі, у якой прымалі ўдзел актыўнейшым чынам ня толькі члены партыі, але, як ужо паказаў, мільёны беспартыйных рабочых і працоўных пластоў нашага сялянства.

І ўсё-жа мы яшчэ натыкаемся на выпадкі, нажаль, нярэдкія, выпадкі глушэньня самакрытыкі. Калі мы гаворым аб самакрытыцы, мы менш за ўсё маем на ўвазе балтаўню аб самакрытыцы, гутарка ідзе аб разгортваньні сапраўды пралетарскай бальшавіцкай самакрытыкі, якія мае сваёй задачай умацаваць рады нашай партыі, зрабіць нашу партыю найбольш магутнай, лепш яе ўзброіць у яе труднай барацьбе за сацыялістычную будоўлю ў нашым Саюзе. Але было-б няправільна заплюшчваць вочы на тое, што ў нас у вялізарным радзе выпадкаў і ў дзволі значнай частцы зьвеньняў нашых партыйных арганізацый самакрытыка яшчэ ня зьвіла сабе моцнага месца ў сыстэме і ў мэтадах работы гэтых арганізацый і ўсё яшчэ мы сустракаемся з выпадкамі зусім недапушчальнага скажэньня лініі партыі ў пытаньнях самакрытыкі.

Мы павінны з найвялікай увагай адносіцца да ўсякай сыгналізацыі аб заціску самакрытыкі, няхай тут будзе і перапавялічэньне, але практыка, якая ёсьць у партыі, занадта горкая. Хто з вас не памятае Астраханшчыны, Смаленшчыны, Армавіршчыны, сочынскай справы і інш., выкрытых ЦКК. Тут таксама пытаньне законамернасьці. Там, дзе мы сутыкаемся з заціскам самакрытыкі, там мы можам прадпалагаць наяўнасьць загніваньня звеньняў нашай партыі, якое дакладна ўскрываецца і таму знаходзяць свой адбітак у тым, што ў гэтым выпадку самакрытыка заціскаецца. Нягледзячы на вялізарныя дасягненьні, якія мы маем у справе разгортваньня самакрытыкі, мы ўсё яшчэ ня можам сказаць поўнасьцю, што мы ўжо дасягнулі таго ўзроўню разьвіцьця самакрытыкі, які дазваляе нам лічыць пытаньне вычарпаным. Пытаньне далёка яшчэ, таварышы, ня вычарпана і задача далейшага разгортваньня здаровай бальшавіцкай самакрытыкі, накіраванай на ўзмацненьне партыі, на павышэньне яе баяздольнасьці, на выкананьне вялікага пляну сацыялістычнай рэканструкцыі Савецкага саюзу, не зьнімаецца з парадку дня.

V. Барацьба за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва

Пераходжу да другой часткі свайго дакладу, якую пастараюся ўлажыць у магчыма кароткі час. Я ўжо гаварыў у пачатку, што задачы барацьбы за адзінства нашай партыі, якія нашы кантрольныя камісіі ажыцьцяўляюць разам з усёй партыяй, ня могуць быць вырашаны ў межах толькі пытаньняў чыста-партыйнага характару, пытаньняў, якія датычаць толькі партыйных арганізацый. Барацьба за адзінства партыі непарыўна зьвязана з барацьбой за захаваньне, умацаваньне саюзу пралетарыяту і асноўных мас сялянства, а гэта значыць, што перад ЦКК РСІ як і перад ўсёй партыяй, стаялі і стаяць задачы ажыцьцяўленьня такіх умоў работы нашых гаспадарчых і савецкіх арганізацый, якія максымальна забясьпечылі-б магчымасьць на справе ажыцьцявіць пастаўленыя партыяй задачы. Паскарэньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, уздым прадукцыйнасьці працы, барацьба са стратамі, зьніжэньне сабекошту, узьняцьце якасьці прадукцыі, разьвіцьцё сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, разьвіцьцё ўсіх новых форм удзелу мас у сацыялістычным будаўніцтве (шэфства прадпрыемстваў над установамі і г. д.), сацыялістычная перабудова сельскае гаспадаркі, барацьба з бюракратызмам, чыстка савецкага апарату, патаненьне і скарачэньне яго і г. д. і г. д. На шляхох вырашэньня гэтых задач знаходзіць сваё вырашэньне адна з асноўных задач, якія стаяць перад ЦКК-РСІ,—задача захаваньня і ўмацаваньня саюзу дзьвёх асноўных кляс нашага СССР.

Падагульваючы работу ЦКК-РСІ, якая ахапляе ўсе разнастайныя галіны нашай гаспадаркі, як у галіне прамысловасьці, так і ў сацыялістычнай перабудове вёскі, а таксама і ў галіне рэарганізацыі работ гаспадарчых і савецкіх апаратаў, трэба сказаць, што побач з многімі недахватамі усё-жа мы тут маем вялізарныя дасягненьні. Гэтыя дасягненьні зусім бясспрэчны. Адным з буйнейшых дасягненьняў трэба лічыць тое, што ЦКК-РСІ за справаздачны пэрыяд здолела амаль поўнасьцю аўладаць мэтадамі масавай работы. Мы ўжо бачылі, што ў справу чысткі нашай партыі былі ўцягнуты мільёны рабочых і блізкіх нам сялянскіх мас вёскі—батрацтва, беднаты і часткова серадняцтва. А ў справу чысткі савецкіх апаратаў, якая знаходзіцца ў разгары, нам удалося ўцягнуць ад 4 да 5 мільёнаў шырокіх беспартыйных мас рабочых і працоўнага сялянства. Нябывалы ўздым актыўнасьці рабочых мас на фабрыках і заводах стварыў і стварае вялізарныя магчымасьці для работы КК РСІ па далейшым уцягненьні мас у справу выкананьня прамфінпляну, барацьбы за якасьць, за зьніжэньне сабекошту, за новыя формы арганізацыі працы. ЦКК-РСІ непасрэдна і шмат якія (далёка, на вялікі жаль, ня ўсе) КК на мясцох зьвязаліся з прадпрыемствамі, афармляючы гэтую сувязь у пастаянную па ажыцьцяўленьні шэфства прадпрыемстваў над установамі. Тут — пашыраючы актыўнасьць і сьвядомасьць пралетарскіх мас у гарадох і пашыраючы актыўнасьць калгаснай масы на вёсцы, адкрываюцца нябывалыя па грандыёзнасьці магчымасьці, як партыі, так і яе кантрольным органам па ўцягненьні гэтых мас у справу ўздыму на больш вышыню сацыялістычнага будаўніцтва, паляпшэньня дзяржапарату і барацьбы з бюракратызмам. Пашырыць сувязь, сапраўдную сувязь з масай—арганізацыйна гэту сувязь замацаваць—такава важнейшая задача, якая стаіць перад КК і РСІ як у цэнтры, так і на мясцох. Трэба, аднак, адзначыць, што буйнейшы недахоп у тым, што не заўсёды і ня ўсюды КК-РСІ на мясцох павярнуліся, па мэтадах сваёй работы, што называецца, «тварам да мас» і «тварам да вытворчасьці».

Слабым месцам у рабоце КК-РСІ на мясцох асабліва выявілася на вясковым вучастку работы нашых кантрольных органаў на мясцох. Слабыя па сваім складу і па сувязі з батрацкімі і бядняцкімі масамі мясцовыя КК - РСІ не заўсёды аказваліся здольнымі сыгналізаваць партыі аб «левых» перагібах, якія мелі месца ў калгасным будаўніцтве. Гэты сур'ёзнейшы недахоп павінен быць ва што-б там ні стала ў далейшым у самы карацейшы тэрмін выпраўлены.

Вялізарная доля работы ЦКК-РСІ за справаздачны пэрыяд была прысьвечана барацьбе за паскарэньне тэмпаў індустрыялізацыі краіны, за плянавую рэканструкцыю, патаненьне і павышэньне якасьці капітальнага будаўніцтва і выяўленьня скрытых рэзэрваў прамысловасьці.

У мэтах абсьледваньня вострага дэфіцыту асноўных будаўнічых матар'ялаў і стварэньня максымальна добрых умоў для капітальнага будаўніцтва НК-РСІ правёў рад абсьледваньняў цягелень, в апняных, цэмэнтных, агнятрывалых прадпрыемстваў, лесапілен і іншых заводаў. Абсьледваньнем было ўстаноўлена, што затрудненьні ў будаўнічых матар'ялах у першую чаргу зьвязаны з буйнымі памылкамі і плянаваньні і рэгуляваньні прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў. Былі выяўлены факты, калі печы буйнейшых падмаскоўных заводаў выкарыстоўваліся ў паасобных выпадках на 50% магутнасьці, а маскоўскае будаўніцтва падвозіць дзесяткі мільёнаў цэглы з паўднёвых раёнаў СССР.

Абсьледваньне 1928—29 і 30 году маскоўскай, ленінградзскай абласцей, Урала, Украіны і Паўночна-Каўказкага краю устанавілі, што магутныя заводы выкарыстаны на 70—90 проц. Па прадстаўленьні НК—РСІ вытворчая праграма на 1928—29 год, складзеная ВСНГ, была павялічана на 220 мільёнаў штук цэглы, 540 тыс. бочак цэмэнту і 600 тыс. куб. мэтраў піламатар'ялаў. Штогодная праверка становішча прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў садзейнічала пашырэньню вытворчасьці матар'ялаў па лініі прамкаапэрацыі. Павялічаны праграмы, капітальныя ўкладаньні, выкарыстаньне малапашыраных матар'ялаў і г. д.

Распрацаваны НК—РСІ праэкт заказу (прыняты ўрадам 26/XII—29 г.) вызначае цэлы рад мерапрыемстваў па аздараўленьні будаўніцтва і паменшэньні яго сабекошту.

У выніку мерапрыемстваў НК—РСІ дасягнуты значныя павялічэньні вытворчых праграм. Вось, напрыклад, па сельска-гаспадарчым машынабудаўніцтве: Любэрэцкі завод (жняяркі, касілкі і інш.) даваў прадукцыю ў 9 мільёнаў рублёў, а пасьля рэканструкцыі паводле праэкту РСІ—32 мільёны рублёў; Варонескі завод (трыеры) паводле пляну заводу 6 т., а паводле праграмы РСІ—18 тыс. і ў 1929—30 г.—36 тыс. Або вось узяць завод «Чырвоны Пуцілавец»: паводле пляну ў 1928—29 годзе—1800 штук, а паводле пляну РСІ—3000 штук, а ў 1929—30 г. паводле пляну ВСНГ і РСІ 12000 штук. Па варштатабудаўніцтве: паводле пляну ВСНГ і заводаў — 22 міл. паводле пляну РСІ—47 міл.

Вялікія посьпехі дасягнуты ў выніку прапаноў ЦКК—РСІ і ў справе скарачэньня імпарту. Праведзеныя РСІ мерапрыемствы дадуць у 1930—31 г. эканомію на імпарце ў 2800 тыс. руб. у валюце.

(*Канец дакладу т. Трылісэра будзе зьмешчаны ў наступным нумары*).

*) Друкуецца пры значным скарачэньні.

Фабрыкі, заводы, саўгасы і калгасы Віцебшчыны, уключайцеся ў усесаюзную пераклічку, дакладвайце XVI зьезду партыі аб сваёй барацьбе за пяцігодку ў 4 гады, аб сацыялістычнай перабудове вёскі

Актыўнасьць рабочых, калгасьнікаў, бедната і серадняцтва накіруем на зьнішчэньне прарываў, на новыя буйныя перамогі ў сацыялістычным будаўніцтве

XIII зьезду КП(б)Б рапартуюць

Калгас „Зьвязда", Лёзьнянскага раёну

Сельска-гаспадарчая арцель арганізавалася на бышай абшарніцкай зямлі ў 1924 годзе з 7 бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак на плошчы 57 га.

У вясну 1930 году ў калгас уліліся 19 гаспадарак і 3 адзінокі. Зараз калгас мае 29 сем'яў, з іх батракоў—4, рабочых—2, беднякоў—12, серадняцкіх—9, служачых—2. Усёй зямлі маецца—331,5 га, з іх: пахаці 167 га, рабочых: мужчын—28, жанчын—25, падлеткаў—8.

31-га мая скончан вясновы сеў. Плян выканан на 100 проц. Высеяна: аўсу—30 га, ячменя—14, ільну—29, канапель—0,25, бульбы—14,5 га. За іх засеяна ў абол пасеўная плошча пашырана на 25 га.

Калгасьнікі на справе даказалі, што беднякі і серадняк могуць будаваць сацыялістычную гаспадарку. Калгасьнікі лічаць, што незаўгаўшыя ў калгас беднякі і серадняк у бліжэйшым часе уступяць у яго і павялічаць яго моц супольна з намі на барацьбу з класавым ворагам.

Па даручэньню сходу праўленьня калгасу „Зьвязда"—Базылеўскі і Янычкін.

Сорак рабочых падалі заявы ў партыю

Апошнія паказальныя выкананьня прамфінпляну на фабрыцы «Дзьвіна» даюць наступны малюнак: ватэра перавыканалі на 3 мая свой плян на 0,5 проц., стара-лентачны пляцецца ў хвасьце, недавыконваючы свой плян на 15—20 проц. за адсутнасьцю рабочай сілы. Значна ўзрос інтарэс рабочых да палажэння партыйных сходаў. Падана рабочымі 40 заяў у партыю і 12 у камсамол. У ліку падаўшых заявы, маецца шэраг рабочых з 20-гадовым рабочым стажам. Работніца чесальнага аддзяленьня т. Мялешка, якая падала заяву ў партыю, прапрацавала на фабрыцы 23 гады. Работніца лентачнага аддзяленьня Зьмітрачэнка працавала на фабрыцы 18 год, зьяўляецца ўдарніцай, членам прэзыдыуму гарсавету і высунута пачынаючым інструктарам лентачнага цэху.

Іваноўскі.

Старшыні і актыў калгасаў Сеньненскага раёну

Беднякі і серадняк, першыя ўступіўшыя на шлях карэннай перабудовы вёскі, шлюць свае палкае прывітаньне партыйным зьездам.

Нашы калгасы, у большасьці арганізаваныя ў гэтым годзе, будуюць сваю сацыялістычную гаспадарку пры наяўнасьці шэрагу цяжкасьцяў.

Дзякуючы ўзрастаючаму энтузіязму калгасьнікаў, нягледзячы на ўсе цяжкасьці, мы змаглі за кароткі час сваёй работы замацаваць арганізаваныя калгасы, наладзілі ўзаемадносіны з акаляючай беднатой і серадняцтвам, не ўвайшоўшым у калгас. К моманту работы зьезду амаль што ўсе калгасы скончылі вясновы сеў. Плян пасеўнай кампаніі выкананы з прашырэньнем, за выключэньнем тэхнічных культур. Контрактацыя насеньнікаў выканана на 120 проц.

Ва ўсіх калгасах арганізаваны батрацка-бядняцкія групы. Арганізавана за гэты час на калгасах 13 яслей і 18 дзіцячых пляцовак, якія далі магчымасьць жанчынам-калгасьніцам прымаць актыўны ўдзел у будаўніцтве калгасаў.

Разам з гэтымі дасягненьнямі маецца шэраг недахопаў у нашай працы.

Ведаючы аб сваіх недахопах, мы, актыў калгасаў, бярэм на сябе абавязак зьнішчыць усе гэтыя прарывы і заклікаем усіх калгасьнікаў нашага раёну.

Лёзунг «Пяцігодка ў чатыры гады» намі будзе выканан.

Старшыні і актыў калгасаў Сеньненскага раёну.

Арцель «Красный»

Вясеньні сеў скончан 4-га чэрвеня. На палёх арцелі засеяна наступнае: аўса—48 га, канюшыны—40 га, ільну—20 га, вікі—12 га, бульба—14 га, гароху—8,50 га, ячменю—8 га, гародніны—11 га, а ўсяго—151,50 га. Апрача гэтага, у сябраў арцелі маецца абсеяных—16 га гароднай зямлі, апрацаванай сіламі сябраў сям'і.

Па даручэньню калгасьнікаў старшыня арцелі Пашацка.

Мая прапанова



Швэйная прамысловасьць у нашым Саюзе хутка разьвіваецца. Кожная фабрыка мае свае пасобныя лябараторыі, якія ствараюць свае мэтады працы, сонні, лекалы, прафбрыгі. Бываюць выпадкі, калі адна лябараторыя хавае свае мэтады ад другой.

Экскурсія працаўнікоў адной фабрыкі на другую такім чынам амаль нічога не дае. Ніводная з фабрык не фіксуе мэтады работы, каб кожная магла зьвярнацца з імі. Напрыклад, адна фабрыка выпрацавала фабрычныя бракі, другая кроіць фабрычным бракам і раздае гатовыя прадметы як бракаваны. На адной фабрыцы на пасобны прадмет ухоўзіць адна колькасьць матар'ялу, а на другой—другая.

Масавыя рабочыя вынаходствы і прапановы скарыстоўваюцца часта толькі на адной фабрыцы. На фабрыцы «Прафінтэрн» адзін рабочы перарабіў простую машыну на спэцыяльную для выметваньня краёў. Гэта магло быць скарыстана і на другіх фабрыках, але гэта вынаходзтва застаецца у сакрэце для другіх фабрык. Можна выдаваць літаграфічныя азбіткі ў блёкноце ў міліметравай форме ведамыя ўстаноўкі вокай фірмоўкі, каб палегчыць працу маркіроўшчыкаў і трэба стандартызіраваць расход матар'ялу. Неабходна стварыць у часопісу «Швэйнік» аддзел, дзе кожная швэйная фабрыка ад часу да часу друкавала б свае практычныя мэтады працы.

Л. Горан.

НІВОДНАГА ГА НЕ ЗАСЕЯНАГА ДА XVI ЗЬЕЗДУ

Поўнасьцю выканаем плян засеву тэхнічных культур—забясьпечым сыравінай прамысловасьць

Усім райвыканкомам Віцебскай акругі

(ПОШТА-ТЭЛЕГРАМА)

Засеў лёну ў раёнах праходзіць надзвычайна марудна,—асабліва ў калгасах Гарадоцкага і Бешанковіцкага раёнаў. Неабходна дабіцца поўнага выкананьня плянаў. У сувязі з пахаладаньнем, тэрмін засеву ільну працягнуты.

Тэрмінова прасуньце насеньне лёну ў глыбінныя пункты, сельсаветы і вёскі. У выпадку недахопу ў засеўдзе правядзіце клін праводзіць сеў лёну ў пары на вольныя палі замест вікаў. Шырока скарыстаць ільготы на засеве тэхнічных культур. Мабілізуйце для правядзеньня сеўбы увесь актыў раёну.

Акрвыканком Сапрыцкі.

Узьняць тэмп засеву тэхнічных культур

(З пастановы СНК БССР)

План засеву тэхнічных культур (лёну і канопляў) на 30 мая выкананы па ільну на 55 проц. і па канаплях на 26 проц., па пляну контрактацыі па ільну і канаплях на 35 проц. Адзначаць, што такое незадавальняючае выкананьне плянаў тлумачыцца ўтварам пасеўных палітычных вагаў пасеву тэхнічнымі культурамі. Акруговым і раённым выканаўчым камітэтам, асабліва Полацкім, Віцебскім і Аршанскім, на ўжыты дастатковыя захады да выкананьня пляну.

Дзеля выкананьня пляну засеву тэхнічных культур і скарыстаньня для гэтай мэты часу засеву, які яшчэ застаўся, прапануецца:

1) Наркамгандлю забясьпечыць выдачу гаспадаркам мануфактуры на менш як на 10 р. на кожны законтрактаваны гектар лёну і канопляў;

2) Белкапраму і Беларускай канторы саюзкантрактацыя забясьпечыць насенным матар'ялам і крэдытам гаспадаркі, якія заключаць дагаворы на кантрактацыю лёну і якім патрэбна насеньне;

3) акруговым і раённым выканаўчым камітэтам ужыць усе захады па дапамозе засеву тэхнічных культур да калгасаў і ўзяць на вялікую маса мабілізацыі ўвагі на калгасах і ў вёсках шляхам і бядняцка-серадняцкіх гаспадаркамі;

4) Белкалгасцэнтру, Наркамату земляробства і Белльнозвазсаюзу пасадзіць у бліжэйшыя дні працаўнікоў на засеву тэхнічных культур.

Плян выканан

Па Лёзьнянскаму раёну вясновы сеўны сеў падыходзіць к канцу. Як па індывідуальнаму сэктару, так і па калгасах пляны выкананы. Калгас «1-е Мая» выканаў на 152 проц. Пляновае заданьне засеву ільну па раёну таксама выканана. Горш справа абстаіць з кантрактацыяй. На 30-е мая заданьне выканана толькі на 70—75 проц.

З насеньнем для засеву палей у гэтым годзе справа абстаіць добра. Спрос насеньніцтва забясьпечан поўнасьцю, за выключэньнем вікі, якую ў раён прысылалі ў вялікім спазьненьні.

Ільнонасеньне засталося нескарыстаным у размеры каля 15 тысяч пудоў. Гэта тлумачыцца няйдбайнымі адносінамі да сваіх абавязкаў з боку райгаспадарсаюзу.

Зараз у раёне неабходна разгарнуць працу па падрыхтоўцы да збору ўраджаю, адрамантаваньня і размеркаваньня сельска-гаспадарчых машын на калгасах. У гэтай працы калгасам і індывідуальным гаспадаркам павінна быць аказана дапамога з боку райвыканкому і іншых сельскіх і гаспадарчых арганізацый.

Васькоўскі.

Увага летнім лесазагатоўкам

Тэмпы індустрыялізацыі краіны даюць вялізарныя затрабаваньні на драўніну. На абвесткі дню стаіць пытаньне аб летніх дровалесазагатоўках.

Між тым пляны летніх лесазагатовак, па нашай акрузе на 1-е чэрвеня г.г. выкананы па загатоўцы лесаматар'ялу на 18,6 проц., а па вывазцы на 8,1 проц. Па загатоўцы дроў на 6,4 проц. і па вывазцы на 6,1 проц.

Гэта ставіць перад намі задачу ўзмацніць работу па лесазагатоўках. Наём рабочай сілы для загатовак трэба правесьці арганізавана. Сельсаветы, райвыканкомы і наогул усе грамадзкія і кааперацыйныя арганізацыі павінны дапамагчы ў гэтай работы. Неабходна забесьпячэньне лесазагатовак рабочай сілай павінна стаяць на першым месцы.

Трэба сур'ёзна прыслухацца да пэрспэктыўных адмоўных з'яў на палешным грамадзкага харчаваньня лесарубаў і лесавозаў.

Разам з гэтым трэба востра паставіць пытаньне аб стварэньні кадра сталых рабочых. У гэтым пытаньні, як нідзе, у Віцебскай акрузе, справа абстаіць дрэнна. Усе цяжкасьці, якія будуць сустракацца ў час правядзеньня лесанарыхтовак, павінны быць перамажаны.

ЛІСТ-ТЭЛЕГРАМА

Усім АВК, РВК і раённым лесбелу

Да ўборачнай кампаніі засталося мала часу. Між тым прарыў ... не выкарыстаны для прыцягнення рабочай і гужавой сілы да загатовак і вывазкі лесу і дроў. Асабліва адстаюць па загатоўкам Полацкі, Віцебскі, Бабруйскі і Чэрвенскі раёны, па вывазцы Барысаўскі, Полацкі, Віцебскі, Чэрвенскі, Магілёўскі, Бабруйскі і Гомельскі.

Прапаную прыняць рашучыя меры па павышэньню загатовак, асабліва, па вывазцы лесу і дроў, з разрахункам скончыць работы да пачатку ўборачнай кампаніі. Справе вывазцы ўдзяліць асаблівую ўвагу, экспартныя пляны павінны быць выкананы поўнасьцю. Праверце гатоўнасьць апарату Лесбела да правядзеньня 2 й чаргі сплаву. Прымеце меры па забесьпячэньню работ прадуктамі і таварамі ў межах мясцовых магчымасьцяў. Старшыня СНК БССР **Галадзед.**

Дапамаглі падшэфнаму сельсавету

Рабочыя ложкавай фабрыкі «Чырвоны Молат» з пачатку веснавай пасеўнай кампаніі кіравалі ў падшэфны сельсавет двух рабочых-брыгадзіраў, якія прапрацавалі там больш месяца.

Акрамя гэтага было адпраўлена на 2 гадзіны на карысьць веснавай сяўбы. З рабочых фабрыкі праведзена некалькі гутарак па сельска-гаспадарчых пытаньнях.

Фабрычная насьценгазета на сваіх старонках увесь час адбівала ход калектывізацыі. Нешэфны сельсавет раней зьявіўся з 3 артыльных калгасьнікаў. З ліку рабочых фабрыкі 3 маюцца 25-тысячнікаў, у калгасы пасланы 2 чалавека. З імі маецца жывая сувязь.

У падшэфны сельсавет пасылаецца літаратура па пытаньнях калектывізацыі і севу. Кепска толькі, што фабком да гэтага часу не прапрацаваў пытаньня аб падрыхтоўцы да асеньняй пасеўнай кампаніі і збору ўраджаю.

Г. К—н.

Райкалгассаюз адстае

Бешанковіцкі райкалгассаюз нядбайна адносіцца да сяўбы. Да гэтага часу няма вучоту пасеву культур у кожным калгасе. Калгас «Зара» атрымаў насеньне кармавых буракоў, якія аказаліся няўсхожымі і непрыгоднымі для сяўбы. З-за нядбайнасьці райкалгассаюзу да сённяшняга часу не атрымаў калгас «Новы Мір» насеньне тытуню, не засеяна тытуню, маючы маркоўкі—адзін кілё. Калгас Сталіна выдаюць грошы на нарыхтоўку бульбы ў той час, калі ў Бешанковічах насеньне бульбы некуды дзявалі і не пачынае пасевца. З боку райкалгассаюзу не было зьвернута ўвагі на сваечасовую раздачу насеньня гароху, калі ўжо позна сеяць гарох, таму што было ...

Таксама не выйсьці і закрылі водсасію, як зараз прыслалі вобкі і хамуты, а рахункі на іх не прыслалі. Замест прысланы перасыльных рахункаў, калгасы атрымалі рахунак на гэтае насеньне, а насеньне засталося ў акрузе. У раёне адчуваецца вялікі недахоп суперфасфату. Акрпалявіснаю не ўзгодніў паступаюы па затры на недастатку суперфасфату ў Магілёўскай і Полацкай акругамі, у якіх маецца ізлішак.

Добрыя вынікі

Калгас «Зара вёскі», Чашніцкага раёну, ужо скончыў вясеньнюю сяўбу. Нягледзячы на недахоп рабочай сілы, мы маем добрыя вынікі.

Аўсом гатунковым засеяна—25 га, ячменям—6,5 га, бульбай—14 га, вікай—15 га, льнонасеньнем — 6,5 га, канюшынай—6 га, гарохам і бабамі—1,5 га, яравой пшаніцай—0,5 га, канаплямі—0,5 га і гароднінай—3 га.

Такім чынам, заданьне па асобных культурах калгасам выканана на 130,65 проц.

Посьпехі, якія мы маем у вясеньняй сяўбе, павінны быць замацаваны. Час падумаць аб зборы ўраджаю і падрыхтоўцы да асеньняй пасеўкампаніі.

А. Бітны-Шляхта.

На маскоўскай абласной партканфэрэнцыі

На ранішнім пасяджэньні маскоўскай абласной партканфэрэнцыі 7-га чэрвеня—з вялікай справаздачай аб рабоце маскоўскага камітэту выступіў сэкратар МК т. Лявонаў. Тав. Лявонаў падрабязна застанавіўся на тэй вялізарнай барацьбе, якую правяла маскоўская арганізацыя з часу 15-га зьезду партыі і контр-рэвалюцыйным трацкізмам і праваапартуністычнымі ўхіламі і хістаньнямі, застанавіўся на напружанай рабоце маскоўскай арганізацыі ў галіне індустрыялізацыі і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У заключнай частцы дакладу т. Лявонаў спыніўся на пытаньні аб снабжэньні рабочых. Маючыяся цяжкасьці могуць быць зьнішчаны пры шырокай мабілізацыі рабочай клясы вакол уздыму сельскай гаспадаркі, пры ўзмацненьні кантролю рабочых над снабжэнчаскім апаратам і пры разгортваньні грамадзкага харчаваньня. У канцы ранішняга пасяджэньня выступіў з справаздачай рэвізійнай камісіі т. Сядой. Галоўнай задачай рэвізійнай камісіі зьяўлялася вывучэньне перабудовы партапарату нізавых арганізацый на падставе дырэктыў маскоўскага камітэту. Тав. Сядой падкрэсьлівае неабходнасьць пашырэньня бясплатнага дабраахвотнага інструктажу ў Маскве і раённых камітэтах.

XI ўсеукраінскі зьезд партыі

ХАРКАЎ, 7. На XI ўсеукраінскім зьездзе партыі адкрыліся спрэчкі па дакладу ЦК УсеКП(б), зробленаму т. Рудзутакам.

Тав. Пліско гаворыць:

— Ад 15-га да 16-га зьезду партыі наш ЦК стаяў на ленінскіх пазіцыях. Усе, хто спрабавалі зьбіць ЦК з правільнага ленінскага шляху—правыя апартуністы і «левыя» загібшчыкі — атрымалі належны адпор. Тав. Рудзутак гаварыў нам аб тым, што правыя ўхілісты ў сваіх заявах адмаўляюцца ад сваіх ранейшых памылак. Аднак, робяць яны ня так, як таго патрабуюць інтарэсы партыі. Мы ведаем аб выступленьні Угланава. Я думаю, што наш 11-ы зьезд КП(б)У скажа Угланаву: «Ты падаў заяву, але яе не апраўдаў і табе ня месца ў новым ЦК, які абярэ 16-ы партзьезд».

ПЕРАВЫБАРЫ ФЗМК ПАВІННЫ УЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Час раскачацца!

Для таго, каб лепш абслугоўваць рабочую масу, клюбы і сады павінны былі-б перабудаваць сваю работу. Між тым клюбныя работнікі бязьдзейнічаюць і прапускаюць міма такую кампанію, як перавыбары ФЗМК.

Працаўнікі саду швэйнікаў імя Леніна нават не пачалі яшчэ задумывацца над тым, што неабходна прыняць удзел у перавыбарчай кампаніі.

На валасапрадзільнай фабрыцы яшчэ канкрэтнага нічога ня зроблена. Абраны толькі брыгады па самаправерцы работы фабкому, але яны ня прыступілі да працы. Адзінае, што зроблена, гэта: па цэхах фабрыкі разьвешаны лёзунгі. Рабочая маса фабрыкі недастаткова мабілізавана для ўдзелу ў перавыбарах.

Зусім іншае мы маем на шчацiннай фабрыцы, дзе пытаньню аб перавыбарах фабкому ўдзяляецца ш м а т ўвагі. Пытаньне аб перавыбарах абгаворана на пасяджэньні фабкому, сходзе партыйцаў і камсамольцаў, праводзяцца гутаркі па цэхах, брыгады па самаправерцы ўжо прыступілі да практычнай работы.

Рабочыя шчацiннай фабрыкі выклікалі на спаборніцтва рабочых шчотачнай фабрыкі на лепшы ўдзел у перавыбарчай кампаніі і падпісалі з імі дагавор.

Па саюзу скурнікаў, наогул, за апошні час, у сувязі з разгортваньнем работы па перавыбарах фабзаўмясцкомаў і падрыхтоўкай да XVI партзьезду—наглядаецца прыток прапаноў рабочых і рост ударніцтва.

Часу засталося мала. Трэба палепшыць падрыхтоўку да перавыбараў фабзаўмясцкомаў.

І. Дварсон.
С. Сьліжыкаў.

У баку ад палітычных задач

Мясцком саюзу мэдсанпраца санаторыі „Сасноўка" амаль ніякай працы не праводзіць. Галоўнейшыя палітычныя задачы выпадаюць з поля погляду мясцкому.

Замест дзелавой работы можна слухаць плёткі між рабочымі і работніцамі, а мясцком, у сваю чаргу, на сваіх паседжаньнях асаблівую ўвагу ўдзяляў разбору гэтых плётак.

У саўгасе «Сасноўка» няма пляну работ, пытаньням арганізацыі працы не займаліся, вытворчыя нарады слаба працуюць, культмасавая работа не вядзецца. І тут знайшліся «аб'ектыўныя» прычыны: у чырвоным кутку дзеці граюць, пагэтаму нельга праводзіць кустаўыя заняткі.

Ніякай працы па ваенізацыі не праводзіцца. Гурткі чырвоных сясьцёр распаліся. Работа па ліквідацыі няпісьменнасьці пастаўлена кепска, ліквідатары назначаюць заняткі, а самі на іх не зьяўляюцца. Калі камсамольцы Іваноўскай зрабілі заўвагу, дык яна адказала: **«Я з вамі дагавору не заключала»**, а другая адказала яшчэ лепш: **«Не хачу ахвяраваць сваім выхадным днём дзеля вас»**. На ўсё гэта мясцком не рэагаваў.

Пытаньні арганізацыі грамадзкага харчаваньня, арганізацыі дзіцячай пляцоўкі — праходзяць міма мясцкому. За тое старшыню мясцкому зрабілі „ганаровым старшынёю рэдкалегіі".

Самакрытыка разгорнута недастаткова, маюцца выпадкі зажыму, аб гэтым гаворыць факт, калі работніца пасьля свайго выступленьня на сходзе па пытаньню недахопаў у рабоце заявіла: **«Мяне цяпер заядуць за выступленьне»**.

Прафэсыянальны актыў не арганізаваны, і ім ніхто ня кіруе.

Неабходна неадкладна перабудаваць работу мясцкому.

Санаторны.

Увязаць перавыбары з падрыхтоўкай да 16-га партзьезду

На адбыўшайся нарадзе пры АПБ прадстаўнікі ЦП саюзаў абмяняліся вопытам і думкай, як лепш правесьці справаздачна-перавыбарчую кампанію.

Да гэтага часу большасьць саюзаў яшчэ ня ўзялі напрамку на ўдарніцтва, не разгарнулі сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне перавыбараў.

Пры правядзеньні работы па перавыбарах ня ўлічваюцца спэцыфічныя ўмовы асобных саюзаў.

Ня ўсюды перавыбары ФЗМК цесна ўвязаны з падрыхтоўкай да 16-га зьезду партыі. Вялізарную ролю ў мабілізацыі мас вакол пытаньня перавыбараў павінны адыйграць клюбы. Але да гэтага часу яшчэ большасьць клюбаў ня прыступілі да працы, не разгарнулі вечары запытаньняў і адказаў, крытыкі і самакрытыкі, не даюць спэцыяльных пастановак, нават няма лёзунгаў і плякатаў.

Выступаючыя таварышы ўказвалі на недапушчальна слабы ўдзел партыйцаў, асабліва камсамольцаў у праводзімай працы. Партыйныя ячэйкі там-сям недаацэньваюць значэньня перавыбараў ФЗМК. У горадзе адсутнічае літаратура па пытаньню перавыбараў.

Друк яшчэ слаба ўдзельнічае ў перавыбарчай кампаніі. Рабкоры да гэтага часу не раскачаліся.

Адмоўным бакам зьяўляецца тое, што няма ўвязкі паміж кіраўніцтвам ЦП саюзаў і АПБ. Дырэктывы ад ЦП пасылаліся непасрэдна на прадпрыемствы, аб якіх АПБ часам і ня ведала. Характэрны выпадак: на махорачнай фабрыцы быў распушчан фабком, перавыбары прайшлі без усякай падрыхтоўкі, «раптоўна». Белкамітэт нават ня ведаў аб тым, што прайшлі перавыбары фабкому.

Толькі за апошнія дні на некаторых прадпрыемствах пачынае разгортвацца праца, але справаздачна-перавыбарчая кампанія не зрабілася яшчэ важнейшай палітычнай кампаніяй.

Партыйным і прафэсыянальным арганізацыям неабходна ўдзяліць максімум увагі гэтай кампаніі.

Жыцельзейф.

Дапамаглі калгасу

Адпачываючыя ў Завольшанскім доме адпачынку (першая партыя) парашылі дапамагчы калгасу „Бальшавік" у рабоце, для чаго аб'явілі „суботнік", і на працягу двух дзён засеялі 4,5 гэктараў бульбы. Адпачываючыя выклікаюць на спаборніцтва наступную партыю.

Галадніцкі.

— Калгас „Авангард", Высачанскага раёну, пры дапамозе саўгасу Крынкі, скончыў сяўбу ў вызначаны тэрмін. Калгасьнікі абяцаюць дапамагчы саўгасу па збору ўраджаю.

(Калгасьнік).

Аб чым пісаць селькору:

1) Як праходзіць сяўба (вынікі, пашырэньне пасеўнага кліну, выкананьне плянавых заданьняў).

2) Як праводзіцца кантрактацыя тэхнічных культур, як у калгасах, так і аднаасобных гаспадарках.

3) Ці пачалася падрыхтоўчая праца да збору ўраджаю.

4) Аб прапрацоўцы тэзісаў к 16 му партзьезду.

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

АГОНЬ—ПА ГЛУШЫЦЕЛЯХ САМАКРЫТЫКІ

Ні воднай заметкі—без рэагаваньня. Парт'ячэйкі, пільна сачэце за дзейнасьцю рабселькораўскіх допісаў

За разгортваньне крытыкі і самакрытыкі!

Пададзены ў маі месяцы газэтай «Віцебскі Пралетары» сыгнал аб неблагапалучнасьці з разгортваньнем крытыкі і самакрытыкі па шэрагу прадпрыемстваў і ўстаноў і прасьледаваньні рабкораў (справа Іванаўскага—фабрыка «Дзьвіна», Драздова—ЦРК, Зісіндэ—скуразавод, Ліхтанберга — абутковая фабрыка, селькора Айола—Сураж) сваячасова быў падхоплены АК і АКК КП(б)Б. 17 мая была пастанова Акруткому, якая прапануе усім партыйным, прафэсыянальным і гаспадарчым арганізацыям у трохдзённы тэрмін даваць адказ на заметкі і прыймаць па іх адпаведныя мерапрыемствы. Пастанова таксама прапануе тэрмінова расьсьледаваць справы аб прасьледаваньні селькораў і глушыцеляў самакрытыкі прыцягваць да суровай адказнасьці.

VI акруговая партыйная канфэрэнцыя канстатавала, што ў нас з разгортваньнем крытыкі і самакрытыкі не зусім благапалучна, што мы маем шэраг прасьледаваньняў рабкораў і падчас упартае з боку паасобных членаў партыі, адказных работнікаў нерэагаваньне на заметкі рабкораў.

Дзе корань зла? Чаму прасьледуюцца рабкоры, селькоры і несвоечасова рэагуюць на заметкі? Няўжо ўсё нерэагаваньне тлумачыцца толькі нягібкасьцю апарату РСІ і пракуратуры? Зусім не. Наадварот—за апошнія часы мы з боку РСІ і пракуратуры маем значныя палепшаньні ў рэагаваньні на заметкі рабселькораў, па заметках прыцягнута шмат асоб да адказнасьці. Галоўны корань зла ў нерэагаваньні на заметкі крыецца ў недастатковым разгортваньні крытыкі і самакрытыкі на месцах і вялікую частку віны трэба аднесьці за кошт партыйных ячэек, якія належнай увагі рабселькораўскаму руху не ўдзяляюць і ў сваёй большасьці зусім ня цікавяцца сваячасовым адказам на заметкі. На адну з актыўнейшых рабкорак т. Веліксон на заводзе «Камінтэрн» накінуліся некаторыя з прыхільнікаў за тое, што яна аб іх пісала ў газэце «Віцебскі Пралетары».

Рабкоры фабрыкі «Дзьвіна» свае заметкі, дадзеныя для зьмяшчэньня ў газэце «Чырвоная Дзьвіна», просяць назад. Гэта гаворыць аб тым, што рабкоры ф-кі «Дзьвіна» баяцца пісаць, бо там маюцца вялікія прасьледаваньні рабкораў і глушэньня крытыкі і самакрытыкі.

Рабкораўскі «налёт» на шэраг прадпрыемстваў і ўстаноў канстатаваў поўнае нерэагаваньне на заметкі з боку адміністрацыі некаторых прадпрыемстваў, ФЗМК і часткова партыйных ячэек. На фабрыцы «Прафінтэрн» за год фабком адказаў на тры заметкі, на акулярнай фабрыцы, мэтпроме, ЦРК, Гарсавеце адміністрацыя зусім не адказвае на заметкі і гэтую віну трэба цалкам аднесьці за кошт партыйных ячэек, якія не дабіваліся рэагаваньня на заметкі.

Мы ведаем, што там, дзе партыйны калектыў цікавіцца рабселькораўскім рухам, там, дзе крытыка і самакрытыка разгорнута—маецца рэагаваньне на заметкі. **Прыкладам можа служыць панчошная фабрыка, дзе ў сямідзённы тэрмін маецца на 95 проц. рэагаваньня на заметкі. І гэта—дзякуючы таму, што партыйны калектыў і фабком** [illegible]. Ці можна [illegible] рэагаваньне на заметкі, калі сакратар кіраўніцтва [illegible] швэйнай фабрыкі на прапанову рабкораў: «Выкінем вас з вашымі заметкамі». Ці калі [illegible]: «Я рабкораў на ведаю і ведаць не хачу».

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што там, дзе няма належнага рэагаваньня на заметкі—крытыка і самакрытыка не разгорнута. Зараз неабходна, каб мы дабіліся налагоджваньня партыйнага кіраўніцтва рабселькораўскім рухам, каб ніводная заметка не засталася без рэагаваньня. Гэтага можна дабіцца толькі тады, калі нашы партыйныя арганізацыі будуць за гэтым пільна сачыць. Кожная ячэйка павінна сабе ўявіць, што нерэагаваньне на заметкі—ёсьць зажым самакрытыкі.

Н. Дзярсон.

Зажымаюць самакрытыку

Масавая праца сярод рабкораў на фабрыцы «Дзьвіна» амаль адсутнічае.

Партыйны калектыў і фабком ніякай увагі падрыхтоўцы да чысткі ЦРК не надавалі, дзякуючы чаму два разы чыстка была сарвана. І чыстка апарату ЦРК праходзіла пры ўдзеле 20—25 рабочых. Бывалі выпадкі, калі партсходы, нарады—таксама зрываюцца. На фабрыцы меў месца факт згвалтаваньня работніцы, аднак, гэта справа была асьвятлена [illegible]. Гэтая справа разглядалася толькі ячэйкай і вакол гэтага пытаньня не была складзена грамадзкая думка. З пытаньнем разгортваньня крытыкі і самакрытыкі на фабрыцы — неблагапалучна. Ёсьць факты зажыму самакрытыкі. Напрыклад, рабкор Керпелеў паказаў на шэраг ненармальнасьцяў на фабрыцы. Ім была падана прапанова аб удасканаленьні [illegible]. Гэта было ўхвалена і ўдасканаленьне праведзена ў жыцьцё, але т. Керпелеў да гэтага часу не прэміраваны. Калі той-ж Керпелеў на шэрагу нарадах паказаў на ненармальнасьці і ўносіў прапановы, [illegible] дырэктар фабрыкі Ахрамейка і прапануе яму, каб ня рабіў шуму. У яго разьлік, што [illegible] Ахрамейка абяцае нават, што больш зараз накіруе яго на працу. З гутарак з асобнымі рабочымі высьветлілася, што некаторыя рабочыя баяцца выступаць на сходах. Дырэктар фабрыкі т. Ахрамейка [illegible]. Але, т.т. Пыжыкаў, Сьмірноў, Пятрова гэты факт замазалі і Ахрамейка аказаўся ня вінаватым.

Таксама маюцца факты, калі рабкоры фабрыкі «Дзьвіна» патрабуюць ад рэдкалегіі газэты «Чырвоная Дзьвіна» свае заметкі назад. На заметкі, зьмешчаныя ў газэце «Чырвоная Дзьвіна» пад загалоўкам «Як выконваецца прамфінплан», «Дайце вушкі», «Скарыстаць [illegible]»,—нягледзячы на тое, што [illegible] датычуцца вытворчасьці і маюць адносіны да ўмоў працы,—ніякага рэагаваньня ня было. На заметкі ў «Чырвонай Дзьвіне» аб [illegible] рабочых Гурскай і інш. сацспаборніцтва таксама няма адказу.

Рабкораўская брыгада: Новікаў, Шэйман, Баград, Дамбе, Абарбанэль і Галубенка.

Цкаваньне рабкоркі

Тав. Веліксон зьяўляецца адной з актыўнейшых рабкорак заводу «Камінтэрн». Яна—адзін з арганізатараў насьценгазэты. Тав. Веліксон, як рабкорка, асьвятляе становішча заводу ў друку, праводзіць рашучую барацьбу з усякімі ненармальнасьцямі, якія маюць месца на заводзе. Яна напісала ў газэту «Віцебскі Пралетары» артыкул [illegible], што група рабочых, куды ўваходзяць і камуністы, як, напрыклад, Булах, зьдзекваецца над работніцай Целяковай.

І вось пасьля паяўленьня гэтай заметкі ў друку, група рабочых, якіх закранае заметка, накідваюцца на т. Веліксон, і сталі прыдзірацца і распускаць па заводу розныя плёткі і нябыліцы. Наогул, стварыліся нясьцерпныя ўмовы для працы т. Веліксон.

А між тым, т. Веліксон працуе на заводзе [illegible], і [illegible].

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што [illegible] групы рабочых, «пакрыўджаных» газэтай. [illegible] таксама расьсьледаваньне [illegible] «Мэтпрамовы» [illegible].

Нельга дапусьціць цкаваньня лепшай рабкоркі т. Веліксон.

Эм.

Прыцягнуць да адказнасьці за нерэагаваньне на заметкі

Праведзены дзесяцідзённы праверкі дзейнасьці рабкораўскіх заметак на фабрыцы «Прафінтэрн» выявіў шэраг [illegible] не толькі нерэагаваньня на рабкораўскія допісы, але і [illegible] зацiску самакрытыкі і цкаваньня рабкораў.

У артыкулах, зьмешчаных у газэтах «Віцебскі Пралетары» і «Шэр ун Айзн»,—партколектыў, фабком і адміністрацыя «Прафінтэрну» маглі-б пачарпнуць шмат карысных прапаноў рабочых. Гэтага не бачым.

Вось некалькі абураючых фактаў, якія выявіла рабкораўская брыгада.

Закройны цэх зьяўляецца вузкім месцам фабрыкі. Яшчэ ў мінулым годзе рабкор Памяранец зьмясьціў у газэце артыкул «Цыфры і факты», у якім ён разабраў [illegible] «эканоміі» і моманты [illegible]. Але артыкул гэты нідзе не разглядаўся, і ня было прынята належных мер, каб ліквідаваць гэтыя недахопы.

Некаторыя рабкоры пачынаюць біць трывогу аб закройнай (Клоснскі — у газэце «Эмэс», Курноў—у газэце «Шэр ун Айзн»). Але іх артыкулы таксама засталіся неразгледжанымі. Таксама не рэагавалі яшчэ на шэраг артыкулаў аб закройнай, загадчыку яе Арансоне, кантралёру Давідаву і старэйшым закройшчыку Гусмане.

Газэта зьвяртала важнае пытаньне аб барацьбе са стратамі, але і да гэтага часу ў мусары можна знайсьці вялікую колькасьць [illegible], нітак, гузікаў і інш. каштоўныя прадметы вытворчасьці. Аб гэтым было ўзьнята пытаньне ў фабрычнай газэце яшчэ ў лютым 1929 г., але на гэта зноў-такі ніхто не рэагаваў. І пасьля гэтага наглядаюцца выпадкі, калі ў мусары знаходзяць каштоўныя рэчы, як-та кішэні, гузікі, ніткі і г. д.

Пісалі ў газэце і аб 2-м падзежным цэху, дзе было выяўлена шмат брыдкасьцяў у кіраўніцтве. Але кіраўніцтва гэтага цэху толькі тады было зьменена, калі вынікі вытворчай праграмы было сарвана.

Ня толькі адміністрацыя не цікавіцца рабкораўскімі заметкамі, але і прафарганізацыі (прафкруг і фабком) і партарганізацыя (цэх'ячэйкі і калектыў).

Характэрна, што за цэлы год рабкоры фабкому ня разглядалі толькі тры заметкі, [illegible] разглядалася на паседжаньні фабкому. Ня раз у газэце пісалі і білі трывогу аб кепскім становішчы працоўнай дысцыпліны, выяўлялі канкрэтных парушыцеляў яе, рвачэй, прагульшчыкаў, але фабком ні на водным з сваіх паседжаньняў не разьбіраў гэтых заметак.

Бюро партколектыву і цэх'ячэйкі таксама не рэагавалі на артыкулы. Так, напрыклад: артыкулы «Фабрыка перажывае цяжкасьці» і «Традыцыі на нашай фабрыцы» — ня былі да канца расьсьледваны. Выніку камісіі ніхто з членаў партыі і рабочых да гэтага часу ня ведае. Пытаньнем аб падрыхтоўцы партыйных кадраў для новай фабрыкі, аб чым пісалася таксама ў газэце, бюро партколектыву не займалася.

Падвёўшы вынікі агляду рэагаваньня на артыкулы ў газэце «Віцебскі Пралетары» і «Шэр ун Айзн»—рабкораўская брыгада адзначае шэраг фактаў несваячасовага рэагаваньня на заметкі.

Брыгада лічыць неабходным зараз-жа направіць усе артыкулы, якія былі зьмешчаны ў газэце і на якія ніякая арганізацыя не рэагавала, — на разгляд РСІ і пракуратуры. А разам з гэтым трэба прыцягнуць да адказнасьці прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі за несваячасовае рэагаваньне на артыкулы.

Р. Б.

Камаеву некалі,—ён сьпяшаецца на курорт

Тэкстыльтрэст на заметкі рабкораў, зьмешчаныя ў газэце «Віцебскі Пралетары» і «Чырвоная Дзьвіна», не сьпяшаецца адказваць. Кіраўнікі трэсту не патурбаваліся [illegible]. На запытаньне брыгады [illegible] старшыня трэсту т. Мазья адказаў: «Запытаваем па тэлефону». Поруч з гэтым брыгада павінна канстатаваць, што нягледзячы на тое, што трэст знаходзіцца у самім горадзе, фабрыка «Дзьвіна» жывога кіраўніцтва ня мае, старшыня трэсту т. Камаеў на фабрыку нават не паказваецца.

Пытаньні пяцігодкі фабрыкі «Дзьвіна» цікавяць кожнага рабочага і работніцу фабрыкі, але гэта, як відаць, мёнш у яго непакоіць кіраўніка трэста т. Камаева, якому няма справы да таго, што фабрыка «Дзьвіна» у гэтым годзе не атрымоўвае новае абсталяваньне. І калі дырэктар фабрыкі „Дзьвіна“ тав. Ахрамейка прыйшоў к т. Камаеву з тым, каб ён дапамог даатрымаць абсталяваньне для фабрыкі, **бо неатрыманьне яго зрывае пяцігодку фабрыкі**,—дык т. Камаеў, замест таго, каб зараз жа прыняць адпаведныя меры, адказаў: **«Я з а р а з уяжджаю на курот, мне некалі»... І—паехаў.**

«Чырвоная Дзьвіна» неаднакраць пісала аб дрэннай якасьці гумавых валікаў, і з боку трэсту ніякіх мер ня было прынята. Завод „Трэугольнік“ дастаўляў фабрыцы гумавыя валікі [illegible]. Але трэст палічыў гэта няважным, [illegible]. Тым самым атрымаў [illegible] на 25 проц., але за тое якасьць пагоршылася на 75 проц. Трэст, замест [illegible] жывога кіраўніцтва, займаецца пісанінай, і бюракратычныя папкі трэсту растуць з кожным днём. Аб самакрытыцы ў трэсьце і паняцьця нават ня маюць. Гэта відаць з таго, што галоўны бухгальтэр Грузін, па словах некаторых работнікаў, сам нічога ня робіць, а толькі займаецца размовамі. Аб гэтым некалькі разоў пісалася ў газэце „Віцебскі Пралетары“ і фабрычнай газэце, але служачыя баяцца яго крытыкаваць. На запытаньне брыгады аднаму з рабкораў трэсту, „як да цябе адносіцца, калі ты пішаш у газэту“, ён адказвае: „Які я рабкор, я ўсяго два разы напісаў“. Гэта гаворыць аб тым, што рабкоры баяцца казаць, што яны зьяўляюцца рабкорамі. Наогул, сходаў служачых бывае мала, і аб разгортваньні крытыкі і самакрытыкі ў трэсьце ніхто нават ня думае.

Рабкораўская брыгада:
Дабравольская, Відмант,
Бляхман і Русакоў.

За заўвагі—звальняюць з працы

У акржылсаюзе няма належнага рэагаваньня на заметкі. **Бюро расьсьледваньня адсутнічае.** Зажым самакрытыкі ў акржылсаюзе мае месца Напрыклад, дзесятнік Кудраўцаў зволіў рабочых за зробленую яму заўвагу. Маецца шэраг другіх фактаў, калі за крытыку адміністрацыя звальняе рабочых. **Ячэйка на гэты факт не рэагавала, да і сама ячэйка амаль ня існуе.**

У бухгальтэрыі маюцца брыдкія факты, недаплаты ў 30—60 р. і пераплаты ў 50—100 р. рабочым. Маюцца факты цяганіны і бюракратычных адносін з боку паасобных работнікаў, калі па 3 разы пасылаюць на работу. Быў і такі выпадак: член саюзу тав. **Тумаркін быў зьняты з працы ў той час, калі ня члены саюзу засталіся на працы. Прараб Каган некалькім рабочым абяцаў перавясьці іх на работу бліжэй да гораду, а потым ён іх зволіў.**

Насьценгазэта пісала аб тым, што на 2-й Маркаўшчыне разьвіваецца карцёжная гульня, і тэхнік Розэ, замест таго, каб змагацца з такім гачебным зьявішчам, робіць розныя паблажкі граўшым. На гэтую заметку ніхто не рэагуе. Можна прывесьці шэраг каштоўных заметак, на якія таксама не рэагуюць.

По даручэньню рабкораўскай брыгады Кісялёва.

Пракурор, за табою слова

Аб тым, што чыстка ЦРК не дасягнула поўнасьцю сваей мэты, мы чыталі неаднаразова ў газэце «Віцебскі Пралетары» і «Цэрабкоопавец». Мала прысутнічала рабочых на чыстцы апарату ЦРК.

Мы маем выпадак, калі за выступленьне з крытыкай розных махінацый прадаўшчыцы Муравінай Г., апошняя два месяцы актыўна прасьледуе і травіць аднаго з лепшых нашых рабочых. Мы гаворым аб нашым гэроі працы, актыўнейшым грамадзкім працаўніку і старэйшым рабкоры аб тав. Дынэру Давіду.

За яго выступленьне нечакана папала пад траўлю і яго сям'я, даходзіць да таго, што спэкулянтка Муравіна праз сваіх прыхільнікаў перадае: «мы іх усё роўна жывымі ня выпусьцім, атруцім, або заб'ем». Шляхам падачы розных заяў у розныя ўстановы, распаўсюджваньня абураючых плётак паўсюды, яна думае, што ёй удасца зрабіць Дынэра адбросам грамадзкасьці, але ёй гэтага ня ўдасцца. Уся грамадзкасьць ведае т. Дынэра ўжо цэлыя дзесяткі гадоў, як перадавіка.

Л. Хацкін.

ЦРК баіцца крытыкі

Адміністрацыя ЦРК на заметкі, зьмешчаныя ў газэтах «Церабкооповец» і «Віцебскі Пралетары» (за выключэньнем пытаньня аб грамадзкім харчаваньні)—не рэагавала. Парт'ячэйка і мясцком у апошні час таксама перасталі рэагаваць, нягледзячы на тое, што газэта біла трывогу па цэламу шэрагу пытаньняў: сацспаборніцтва, павышэньню рэальнай зарплаты. Неабходна адзначыць, што газэта «Церабкооповец», у асноўным, справілася са сваёй задачай—яна змагла арганізаваць вакол сябе рабкораўскую масу, асьвятляючы важныя пытаньні. Газэта выкрыла зажым самакрытыкі з боку загадчыка 21-га магазына, прасьледваньне рабкора Гельфанда. Рэдкалегія дабілася зьняцьця з працы загадчыкаў 21-га і 4-га магазынаў. Такім чынам, газэта сваячасова сыгналізавала аб недахопах і дабілася посьпехаў. Мясцкому трэба ў далейшым зьвярнуць больш увагі рэагаваньню на заметкі.

Неабходна зараз дабіцца тэрміновага рэагаваньня на заметкі з боку адміністрацыі ЦРК.

Рабкораўская брыгада: Дворкін і Дынэр.

АПБ тварам да вытворчасьці не павярнулася

22-га мая на фанэрным заводзе была склікана інструкцыйная нарада дабрахвотных брыгад па правядзеньню самаправеркі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на якую павінен быў прыйсьці **сэкратар АПБ т. Градштэйн**, які ня прыбыў. У красавіку **месяцы таксама заўком дагаварыўся з т. Градштэйнам аб прыездзе на завод—для правядзеньня інструкцыйнай нарады, але і тады тав. Градштэйн таксама не зьявіўся.** Наогул з боку Акрпрафбюро фанэрны завод ніякай дапамогі ня мае, а наадварот—паасобныя адказныя працаўнікі, **як, напрыклад**, т. Градштэйн, зрываюць працу. Поруч з гэтым неабходна адзначыць, што АПБ ніякай увагі фанэрнаму заводу ня ўдзяляе, нягледзячы на тое, што завод мае шэраг недахопаў і буйныя прарывы.

Шэйнман.

„Трэба-ж аб чым-небудзь напісаць“

Абсьледаваньне рэагаваньня на заметкі на заводзе „Чырвоны Мэталіст“ паказала, што ў некаторых выпадках адміністрацыя, партыйная ячэйка і фабком—нядбайна аднесьліся да справы рэагаваньня на рабкораўскія артыкулы. Аб гэтым сьведчыць пастанова бюро партыйнага калектыву, у якой зафіксавана: „факты нерэагаваньня на заметкі сьведчаць аб наліччы на заводзе з боку гаспадарчых, прафэсыянальных і партыйных арганізацый—аб'ектыўнага заціску самакрытыкі“.

Што-ж мы маем на справе?

На заметкі рэагавалі толькі ў тых выпадках, калі даваліся паўторныя запытаньні.

Рэагуючы на заметкі, адміністрацыя ішла па лініі найменшага супраціўленьня, і ў выніку гэтага шмат заметак, важных для выпраўленьняў недахопаў вытворчасьці—засталіся без рэагаваньня. Як, прыклад, можна прывесьці, што заметкі **рабкора Рыжынскага аб прастоях, рабкора Б—о—аб браку, Баганава—аб рацыяналізацыі, брыдкасьцях на саламарэзках і цэлы шэраг іншых заметак —ніхто не рэагаваў.**

Адміністрацыя нават не знаходзіла патрэбным сваячасова адказваць рэдкалегіі,—ці прыймаюцца па тых ці іншых заметках якія-небудзь захады. Цэхавыя адміністратары ў большасьці няпрыхільна адносіліся да рабкораўскіх заметак (інструктары: Каваленка, Дамброў, Сяргеенка, Фрумкін, Піпкоў і Жарскі).

Сярод работнікаў адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу можна чуць такія размовы: «Пісаць лягчэй, чым рабіць,—трэба-ж аб чым-небудзь напісаць».

Гэтыя размовы гавораць аб тым, як пастаўлена рэагаваньне на заметкі з боку нізавой адміністрацыі.

На пытаньне, пастаўленае адміністрацыяй «Скажэце, вы адчуваеце дапамогу ў сваёй працы з боку насьценгазэты», пасьледваў адказ: „Амаль ніякай дапамогі ня маем“.

Хаця ў некаторых адносінах фабком рэагаваў на самыя бічуючыя заметкі, але ўсё-ж на шэраг заметак вытворчага характару рэагаваньня зусім ня было.

Заўком у сыстэму сваёй работы ня ўвёў кантролю над рэагаваньнем на заметкі.

Быў абураючы выпадак, калі замест рэагаваньня на заметкі ў ліцейным і мэханічным цэхах ўзвалілі ўсю віну на рабкораў, пісаўшых гэтыя заметкі, т.т. **Баганова і Скітава**. Цікава адзначыць, што на пасяджэньні цэхкамітэту мэханічнага цэху, на якім разглядалася заметка Баганава, была прынята, па настойваньню старшыні т. Тарантовіча, наступная прапанова: „Лічыць заметку ў адносінах да Дамброва несапраўднай“.

Вось як цэхавыя камітэты трымаюць у цісках самакрытыку.

З боку цэхавых партыйных ячэек таксама дрэнныя адносіны да справы рэагаваньня на заметкі, што абмяжоўваецца прымірэнцтвам з боку паасобных членаў партыі і цэхбюро да справы рэагаваньня на заметкі і разгортваньня самакрытыкі.

Бюро партыйнага калектыву таксама ня прыняла належных мер, каб забясьпечыць сапраўднае разгортваньне самакрытыкі і сваячасовае рэагаваньне на рабкораўскія заметкі.

У выніку гэтага наглядаецца слабы ўзрост рабкораў на заводзе.

Неабходна раз назаўсёды палажыць канец нядбайным адносінам да рэагаваньня на рабкораўскія заметкі і прыняць адпаведныя меры да тых, хто трымае ў цісках самакрытыку.

Б. Р—н.

„Выкінем вас з вашымі заметкамі“

На пабудове швэйнай фабрыкі і шчаціннага камбінату працуе 600 чалавек. Сярод гэтай вялікай масы рабочых палітыка-выхаваўчая работа амаль адсутнічае.

Саюз будаўнікоў ніякай увагі не зварочвае на гэты вучастак работы, у выніку чаго рабочая ініцыятыва на гэтых пабудовах не праяўляецца і грамадзкасьці тут зусім не адчуваецца.

Рабочыя ў сацспаборніцтва зусім не ўцягнуты. Ударніцтва лічыцца толькі на паперы. **6 брыгад, лікам у 140 чалавек, распаліся, не пасьпеўшы моцна стаць на ногі. Пачаўшыся было працоўны ўздым ня быў нікім падхоплены.** Тэхсэкратар рабачкому т. Хаціна, пры ўзыманьні сяброўскіх узносаў, адначасова ўзымае ўзносы па лініі ўсіх грамадзкіх арганізацый Ніякага арганізатарскага ядра вакол гэтых арганізацый ня створана. **Кругом — паўнейшая мяртвечына.** Ледзь заметна б'ецца пульс рэдкалегіі насьценгазэты. Для работы рэдкалегіі і чырвонага кутку няма месца.

Для таго, каб напісаць заметку, р а б к о р а м прыходзіцца устрайвацца на штабелі, стройматарыял і інш. **Друкаваць матарыял для насьценгазэты на машынцы адміністрацыя не дазваляе.** Рабочым прыходзіцца насіць свае заметкі ў якую-небудзь школу, каб друкаванымі літарамі напісаць іх рукой. **Неабходна адзначыць недапусьцімыя грубыя адносіны к членам рэдкалегіі з боку сэкратара кіраўніцтва т. Марозава. Калі рабкораўская брыгада, сумесна з членамі рэдкалегіі т. Пухавіцкім і Александравым. зайшлі ў кантору паглядзець, як друкуецца матарыял, тав. Марозаў нас сустрэнуў з такім сказам: «Мы вас хутка выкінем адсюль з вашымі заметкамі».** Такія абураючыя выкрыкі ў корні забіваюць усякае праяўленьне рабочай ініцыятывы. Газэта бічуе шэраг недахопаў, але яна ніразу яшчэ не атрымала адказу на заметкі. Усё гэта сьведчыць аб поўным адрыве саюзу будаўнікоў ад рабочых гэтай пабудовы. АПБ трэба тэрмінова зацікавіцца становішчам працы.

Рабкораўская брыгада—
Гілодзі, Гінзбург.

Трэба палажыць канец!

Пераглядваючы акты рэагаваньня адміністрацыяй і фабкомам акулярнай фабрыкі на заметкі рабкораў, мімаволі кідаецца ў вочы розьніца паміж фабкомам, хутка адказваючым на заметкі і ліквідуючым недахопы, мяшаючым ў працы, і адміністрацыяй злачынна маўчаўлівай, ня лічычай неабходным адказваць на заметкі.

Рабкор «Крытык» у заметцы «Зусім як дзяржыморда» піша аб грубасьці кіраўніка кантрольнага аддзеленьня Фішкавай, якая застаўляе ўбіраць **кваліфікаваную работніцу Азёрнікаву** з падлогі раскіданыя паперкі, крычучы: „Я прыказваю вам іх убраць“. Такі зварот да работніцы выклікаў абурэньне рабочых. Адміністрацыя па гэтаму ніякіх захадаў ня прыняла.

Работніца ў сваёй заметцы «Няўжо нельга абыйсьціся без прыватнікаў» піша, што прыватнік Гельцар, снабжаўшы ўвесь час фабрыку бархаткамі для прэдахраніцельных акуляр, часта ствараў перапынкі ў працы з-за несваячасовай падноскі бархатак.

Паявілася аб гэтым у газэце заметка. Дырэктар, замест рэагаваньня, бярэ і пакупае ў таго-ж Гельцэра машыну, а яго самаго забірае на фабрыку, плацячы яму як спэцу па 150 руб. у месяц у той час, калі разрэзка бархату вытвараецца па шаблёну і гэтую працу змагла-б лёгка выканаць любая работніца.

Падобная гісторыя была і з прыватнікам **Кабішчарам**, якому аддаюцца заказы на рамкі для масак пры наліччы на фабрыцы двух жасьцянікаў. Рабкор абураны і запытвае: „Калі ёсьць недахоп у жасьцяніках, дык зачым здаваць закавы прыватніку, а не ўзяць яшчэ аднаго рабочага“.

Здавалася-б, што адміністрацыя павінна была-б хутка рэагаваць на заметкі, паказваючыя аб сувязі з прыватнікам і выправіць сваю памылку, але... цьвёрдалобыя адміністратары акулярнай прайшлі міма гэтых агідных фактаў, як і ўсіх іншых рабкораўскіх заметак.

Г. Каган.

ТЭЛЕГРАМЫ

Баяцца праўды аб СССР

БЭРЛІН, 7. Цэнтральны камітэт нямецкай сацыял-дэмакратычнай партыі апублікаваў у «Форвертсе» пастанову, па якой членства ў «Саюзе прыхільнікаў СССР» несумесцімае з прыналежнасьцю да сацыял-дэмакратычнай партыі. Рашэньне абгрунтоўваецца тым, што «Саюз прыхільнікаў СССР» зьяўляецца такой-жа камуністычнай арганізацыяй, як і саюз чырвоных франтавікоў, Міжрабпом, МОПР і забаронены фашысцкі маладая гвардыя. «Саюз прыхільнікаў СССР» праводзіць зараз у Нямеччыне кампанію за пасылку рабочай дэлегацыі ў СССР. Рашэньне ЦК прынята для таго, каб не даць сацыял-дэмакратычным рабочым магчымасьці разблачыць брахню сацыял-дэмакратычных правадыроў аб Савецкім Саюзе.

Тэрор белагвардзейскіх банд

ТОКІО, 7. Як паведамляюць з Харбіну, тэрор белагвардзейскіх банд, апрыходзючых у раёнах Хайлара, і Ядзяншы — узмацняецца. У пасёлку Шыншэн белагвардзейцы арыштавалі і забілі 20 кітайцаў.

Забастовачны рух у Гішпаніі ўзрастае

ПАРЫЖ, 3. Як паведамляюць з Мадрыду, забастовачны рух у Гішпаніі усё ўзрастае. Забастоўка рабочых камяналомняў у Мадрыдзе працягваецца з нязменнай сілай. У Караліне ўспыхнула забастоўка каўрошчыкаў і гарнякоў. У правінцыі Малага адбываецца забастоўка сельска-гаспадарчых рабочых, якія патрабуюць павялічэньня зарплаты і скарачэньня рабочага дня. У Більбао бастуюць школьнікі. Рад забастовак закончыліся перамогай рабочых.

Па Савецкаму саюзу

Новы прыкладны статут

МАСКВА, 7. Калгасцэнтр СССР распрацаваў і разаслаў на водзу мясцовым арганізацыям новы прыкладны статут таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Новы статут азначае, што члены таварыства пашыраюць пасеўную плошчу, устанаўліваюць правільны севазварот, праводзяць агракультурныя мерапрыемствы і г. д. Усе прыватныя зямля ідзе ў абагульненую апрацоўку сумесна, абагульняюцца зямельныя плошчы. Сумесныя ўтрымальныя коні ў таварыстве абавязковы толькі ў часе палявых работ. Уступныя ўзносы ў таварыства ўносяцца грашовы ўзнос у памерах ад 3 да 10 руб. у залежнасьці ад маёмаснага стану. Права выхаду з таварыства дарэцца мае кожны. З прыбыткаў, атрыманых таварыствам у працягу году, пакрываюцца гаспадарчыя выдаткі і вызваляюцца адлічэньні на рабочыя сельска-гаспадарчага інвэнтару з разьмерам ня звыш 2 руб. за га.

Становішча пасеваў асаоліва здавальняючае

РАСТОЎ-ДОН, 7. Становішча пасеваў амаль усіх культур у паўднёвых акругах краю ў гэтым годзе асаоліва здавальняючае. Добра разьвіваюцца каласавыя, прапашныя культуры і сахарныя буракі. У садох ідзе збор чарэшні і клубнікі. Вінаграднікі ў поўным цьвеце. 5 і 6 чэрвеня ў краі адзначана рэзкае паніжэньне тэмпэратуры, даходзіўшае ў некаторых мясцох да 10 градусаў у працягу сутак. Па ўсяму краю прайшлі дажджы. Устанавілася пасмурная пагода.

Прыезд амэрыканскіх эканамістаў

МАСКВА, 7. У чэрвені у СССР прыяжджае група вядомых эканамістаў Злучаных Штатаў Амэрыкі, на чале з прафэсарам калумбійскага ўнівэрсытэту Генры Логер. Амэрыканскія вучоныя і эканамісты наведаюць Маскву, Ленінград, Ніжні-Ноўгарад, Сталінград (саўгас «Гігант»), Растоў-Дон, Днепрапятроўск, Днепрабуд, Данбас, Харкаў і Кіеў.

Пуск заводу

ЗЛАТАЎСТ, 7. У падарунак 16-му парт'зьезду пускаецца ў ход новы цагельны завод, вытворчасьцю ў 2 мільёна цэглы ў год.

„Для мяне саюз не закон"...

У канторы друкарні «Камінтэрн» галоўным бухгалтарам працуе член партыі т. Невяжскі, выключаны падчас чысткі за бюракратызм, але адначасна ўсё яшчэ займаецца ў кантроле кантрольнай камісіі.

Як-жа гэты член партыі пасьля чысткі імкнецца выпраўляць свае памылкі?

Вось факты.

Пры правераў дагавору па сацспаборніцтву брыгады сустрэнуліся з фактам, што служачыя канторы зусім не ўдзельнічаюць у сацспаборніцтве. Зводкі па выкананьню прамфінплану рыхтуюцца на працягу некалькіх дзён, ды і то здаюцца з спазьненьнем на цэлы месяц.

Калі на сходзе партыйнай ячэйкі перад Невяжскім паставілі пытаньне аб прадстаўленьні гэтых зводак акуратна за кожную дзесяцідзёўку, дык ён грубіянскі адказаў: «Гэта толькі прыгожыя словы».

Пры выплаце зарплаты рабочым часта бываюць выпадкі абліччаньня. Калі групком хоча па гэтаму пытаньню ў Невяжскага навесьці спраўку, дык апошні адказвае: «Саюз мне не закон і ня мае права ўмешвацца ў гаспадарчыя справы».

Работніцы-выдучаны т. Віват патрабавалася спраўка аб рабочым стажы. Невяжскі папанаваў выдаць ёй даведку аб стажу з 1925 г., у той час як яна працуе з 1920 г.

Аб «лішнім» партыйным Невяжскім ужо ня раз пісалі ў газэце «Факел Пячатніка», але ніхто на гэта не рэагуе.

Лучаскі.

Паштовая скрынка

Добра ведаючаму—«Аб Камароўскім»—нерэафруецца, на войдзе. **В. Азярной**—«Старые сняли, новые не делают»—направлена ў Акрзьвыт № 5. **В. Воліну**—«Не усе адзінаканчыні»—направлена ў пачатак. Беллпатэхнікумаўцу—«Не знайшлі лепшага», **Ранеру**—«Требует наблюдения», **Іоффе**—«Слово и дело», **Н. Іголіннай**—«Аб беднацкай бальніцы», **Глазу**—«Христос воскресе». **Пазьнякову**—аб 10-й школе-сямігодцы, **Я. Чырвонаму**—«Раўняйцеся на нас», **Юрасоўскому**—«На службе ў кулаку», **О.**—«Кулак, а не калгасьнік»—на тэхнічных прычынах не скарыстаны ня будуць.

Пайсаховічу—аб сталоўцы МББ чыг., **Н. Лобачову**—«Як ведаюць да батракі», **Праніну і Аксіну**—«Куды глядзіць страхкаса», **Яраму Будняму**—«Як гэта здарылася», **Біб-Еобу**—«Кволае кіраўніцтва», **Цыхаму**—«Як ведаюць ...», **Ярыку**—«Аргаціла гэты праўду беднаты», **С. А.**—«Ударны брыгады ў вёсцы», **Айолу**—«Уйма безобразий»—пераданы ў заметкі скарыстаны ня будуць, аб гэтым ужо пісалася.

Вайнаву—аб кулаку Дзянясевічы—паперадана на расьсьледаваньне.

Сельнору—«Запугвалі калектыўных бедняков», **Сімяну**—«Як сіроцінцы калгас», **Я. Лясьніковы**—«Падрыхтоўка да веснавога сезону», **Інсу**—«Жанчыны пад гнётам», **Кабыліну**—«Даволі цярпець», **Сельнору**—«Партыйным прамоўцам», **Я. Кахоўскому**—«Парушаюць пастанову», **Паташынскаму**—«Патрэбны чыгуначны сухадол», **Наглядчыку**—«Сумеснае працуе ў крамы»—«Сумеснае выходзіць сумел», **Успеду**—«Калгас выкачвацьца у ваду», **Пашкову і інш.**—«Безвыходная праўда», **Лучкі**—«Лучшым будзеў», **Ведачку**—«Пракуратура, дзе ты», **Т. Ігнатьевскаму**—«Запад калектывізацыі», **В. К.**—«Аб будучых паказніках», **Снайму**—«Пасьпешлівасьць», **Сталючаму**—«Место свиданий», **Ершыну**—«Де установка», **Розину**—«Пацурные пісьмы», **Свайму**—«Гэта не пакажаж», **Уднікіну**—«Што ж каза», **Пятровому**—«аб камісіі садзеіяльністы кааперацыі», **С. В.**—«Балакаў», **Вучкіна**—«Не ўсё гладка», **Біяжэнку**—«Працягвае ўсё пазнача», **Артуру**—«Непарадкі», **Сокалаву**—«Шкарлік шуралуп», **Сяўкаць**—«Бабка за прыраду», **Сельяніну**—«Аблохкі кулака»—перадаваць заметкі не будуць, бо няма цікавасьці ані для райкомаў, ні для газэты, альбо друкаваныя газэты.

Ніконавай—Ваша заява перасланы ў дзяльніцкі рабочым саюзу сельхаззавода.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Віцебскага Акрвыканкому ад 7-га чэрвеня 1930 г. аб складаньні кантрольных лічбаў на 1930—31 гг.

У сувязі з тым, што шэрагам прадпрыемстваў і арганізацый, таксама інспэктарам АВК не выканана паказаньні аб прадстаўленьні неабходных матар'ялаў для складаньня кантрольных лічбаў на 1930—31 год на 1-га чэрвеня, прэзыдыум АВК пастанаўляе:

Абавязаць усе арганізацыі, прадпрыемствы і інспэктароў АВК не пазьней 12-га чэрвеня г.г. прадставіць усе матар'ялы для складаньня кантрольных лічбаў на 1930—31 г. у адпаведнасьці з паказаньнямі і формамі акрпланкому.

У выпадку непрадстаўленьня ў вызначаны тэрмін матар'ялаў, справы перадаваць пракурору для прыцягненьня віноўных да адказнасьці.

Нам. старшыні АВК Пайкін.
Сэкратар Кін.

Усім прадпрыемствам і арганізацыям Віцебскай акругі

У сувязі з неабходнасьцю складаньня кантрольных лічбаў па падрыхтоўцы кадраў па Віцебскай акрузе на 1930—31г., прэзыдыум Віцебскага АВК прапануе ўсім прамысловым гаспадарчым, будаўнічым, каапэрацыйным установам і арганізацыям пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў скласьці зьвесткі аб патрэбнай рабочай сіле на 1930—31 год, уключаючы тэхнічны пэрсанал і накіраваць іх у АВК не пазьней 15 чэрвеня.

Рабочая сіла, патрэбная для будаўнічых і сэзонных работ, паказваецца асобна.

Зьвесткі складаюцца на падставе кантрольных лічбаў на 1930—31 г., ад незалежна ад канчатковай апрацоўкі апошняй, павінны быць строга абгрунтованы, на падставе прадугледжанага пашырэньня вытворчасьці і новага будаўніцтва.

Зьвесткі неабходна прадставіць па наступнай форме:

Назва ўстановы:

Пералік кваліфікацый	Колькасьць рабочых: У 1929—30 г.	Мяркуецца мець у 1930—31 г.	Неабходна дадаткова

Да лічбовых зьвестак дадаецца кароткая тлумачальная запіска з абгрунтаваньнем лічбавага матар'ялу

Нам. Старшыні АВК Пайкін.

Адчыненьне 3-й акруговай канфэрэнцыі ОЗЕТ

Учора, а 8-й гадзіне ўвечары, у клюбе яўпэдтэхнікуму адчынілася 3-я акруговая канфэрэнцыя ОЗЕТ.

Канфэрэнцыю адчыніў з уступным словам старшыня акруговага праўленьня ОЗЕТ т. Калецкі.

Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму-рапарт XIII зьезду КП(б)Б.

На вячэрнім пасяджэньні канфэрэнцыя заслухала даклад старшыні Бел. ОЗЕТу т. Сакалоўскага, пасьля чаго разгарнуліся шырокія спрэчкі.

ПАПРАЎКА

У паведамленьні аб прыёме слухачоў у Бельскі тэхнікум малочнай гаспадаркі, надрукаваным у нашай газэце ад 26 мая г. г. укралася памылка: надрукавана, што прыём заяў працягваецца да 15 чэрвеня, трэба чытаць да 15 жніўня.

Ці ёсьць адводы?

Ячэйкамі 2-га раёну КПБ прыняты ў кандыдаты партыі наступныя таварышы: Рудзін М., Эйдэльштэйн Г. А. (яч. КП(б)Б 2-й ф-кі «Прафінтэрн»), Шустаровіч З. І. (яч. 3-й ф-кі «Прафінтэрн»), Міцэвіч І. І., Архіпаў Г. (яч. маслазаводу), Сокалаў М. А., Чаргоні Г. П., Зейф М. М. (парткалект. ф-кі «Прафінтэрн» № 1), Манюк К. І., Калатыгін А., Шмыр Н. Т., Кабзун В. Д. (калект. КП(б)Б МББ чыг.).

Пераведзены з кандыдатаў у сапраўдныя члены КПБ тт.: Галынкер М. Л., Марковіч Р. А., Нудэльман М. Т, Левінсон Л. М., Арансон Л. Г. (калект. КП(б)Б ф-кі «Прафінтэрн» № 1), Ярухімаў І. К. (яч. КП(б)Б абутковай ф-кі), Кузьнечыкаў П. Ф., Пржавальскі П. Н., Ранцаў Я. (калектыў МББ чыг.), Беськіна (яч. КП(б)Б 3-й ф-кі «Прафінтэрн»), Каган С. Л. (яч. КП(б)Б ЦРК), Каваль С. (яч. КП(б)Б 3-й ф-кі «Прафінтэрн»).

Калі ў каго маюцца зьвесткі, характарызуючыя вышэйпамянёных таварышоў, як непатрэбных і нямогучых быць у партыі—паведамеце 2-гі райком КПБ (Вагзальная, 41) у 3-дзённы тэрмін з дню абвесткі.

Паведамленьні

Ад АКК КП(б)Б

Сёньня, 9-га чэрвеня, а 6-й гадзіне ўвечары, для разгляду партсправы АКК КП(б)Б выклікае наступных тт.: Лабедчанка Е., Гаварко В. Г., Рагавенскага В., Ермаловіч А., Ражагінская М., Анушчанка Е. М., Рагажынская Ф., Сургавая Х. В., Мішчанка С., Грышанава П. К., Шышкова Г. А., Гарацько Г. С., Гурская С. М., Быкава Д. Х. (ф-ка «Дзьвіна»), Цюніса В. Г. (савецкі 2-га РК КП(б)Б), Карабейнікаў А. (фанэразавод), Усачова С. М., Варабёва Н., Лабейка Н. А., Сівалобчык Я. В., Ляхтук В. С. (ф-ка «Дзьвіна»), Радзівонава В. (яч. сельсаюзу), Лейтман І. Ш. (заг. Чырв. Металіст), Грыгор'ева В. А., Суханава П. І., Ельцава Д. С., Ахачынская Ц. А. (МББ чыг.), Грыф Л. Е. (яч. ЦРК), Мельнікава Л. І. і Рыбамова А. В. (МББ чыг.).

Апрача гэтага выклікаюцца ў абавязковым парадку сакратары парт'ячэек, у якіх памянёныя тт. састаяць на ўвучоце.

АКК.

Сёньня, 9 чэрвеня, адбудуцца пленумы секцый Гарсавету:

Прамысловай секцыі а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Гарсавету.

Камунальнай секцыі а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Камгаса.

Гандлёва-кааперацыйнай секцыі а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Гарсавету, пакой № 5.

Фінансава-падатковай секцыі а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Акрфінаддзелу, пакой № 10.

Секцыі аховы здароўя а 7 гадзіне ўвечары ў клюбе медработнікаў (Замкавая № 5) з наступнай павесткай дня: 1) Аб мядыцынскім абслугоўваньні сэзонных рабочых (Казарноўскі). 2) Гарадскае харчаваньне ў Віцебску (Горскі). 3) Бягучыя справы.

Працы і забясьпечаньня а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Гарсавету пакой № 10. Павестка дня: 1) Справаздача Сабезу. 2) Садаклад камісіі. Запрашаюцца інваліды.

Секцыі нарасьвету а 7 гадзіне ўвечары ў зале Белпэдтэхнікуму з наступнай павесткай дня: 1) Даклад інспэктара прафобра аб падрыхтоўцы кадраў. На пасяджэньне запрашаюцца настаўнікі, студэнцтва і слухачы курсаў па падрыхтоўцы ў тэхнікумы, прафшколы і ВНУ.

Яўка ўсіх членаў секцый і рабочых — абавязкова.

— Сёньня, а 8 гадз. увечары, у памяшканьні Палацы працы пакой № 21, склікаецца нарада загадчыкаў культмасавых сэктараў усіх ФЗМК па пытаньню перабудовы культмасавай працы.

Яўка абавязкова і без спазьненьня.

— Сёньня, а 6 гадз. увеч. у памяшканьні Гарсавету, пакой № 3, адбудзецца нарада членаў вайсковай сэкцыі Гарсавету па пытаньню аб пераўкамплектаваньні складу сэкцыі і выбары бюро.

Яука ўсіх членаў сэкцыі — **абавязкова.**

Для сведения кустарей

С 10-го июня при клубе кустарей открывается детская площадка для детей членов артелей, кустарей-одиночек и пайщиков кредитного товарищества.

Принимаются дети в возрасте от 4-х до 7-ми лет.

Заявления принимаются в куст-промсоюзе (культотделом, Рыночная 13).

К заявлениям должны быть приложены следующие документы:

1) Метрическая справка о возрасте.
2) Справка о месте работы и зарплате.
3) Справка о состоянии здоровья.
4) Кто работает (мать или отец).

В заявлениях указывать точный адрес местожительства.

Правление.

— 10-га чэрвеня пачынаюцца летнія гульні па футболу, баскетболу, валейболу, тэнісу і гарадкам.

Заяўкі прыймаюцца да 8 чэрвеня.

Гульні будуць адбывацца: на цэнтральнай пляцоўцы, у Маркаўшчыне і у «Суботніку». Спаборніцтва па гарадкам будзе праходзіць па буйнейшых прадпрыемствах, маючых пляцоўкі: швэйнікаў, мэталістаў, дражджавога заводу і друг.

— 10-га чэрвеня, а 6-й гадз. увечары, у памяшканьні аддзелу агітацыі і масавых кампаній адбудзецца пасяджэньне сакратароў масавай агітацыі, на якое павінны зьявіцца тт. **Градштэйн, Пескіна, Рывкін, Дрындоўскі, Сімунін, Беразаўер (падвал), Літвін, Рабкін і Івашнін.**

Яўка абавязкова.

Сёньня, а 12 гадзіне дня, у памяшканьні аддзелу агітацыі і масавых кампаній АК КП(б)Б адбудзецца пасяджэньне сакратароў шэфства і грамадзкіх арганізацый, на якое павінны зьявіцца тт.: Рубін, Смолін, Гінзбург, Брэкман, Навіленка (СВБ), Магарыл, Варабёў (падвал), Наган («Чырв. Мэт.») і Лосеў.

— 10-га чэрвеня, а 10-й гадзіне раніцы, адчыняецца канфэрэнцыя асьветнікаў гораду з павесткай дня: 1) чарговыя задачы партыі і савецкай улады ў рэканструкцыйны перыяд і роля асьветнікаў, 2) аб падрыхтоўцы школ да году, 3) сацыялістычнае спаборніцтва школ, 4) аб пашырэньні сеткі школ, 5) выбары сацспаборніцтва.

Яўка ўсіх асьветнікаў і піянэрарганізацый школ абавязкова.

Запрашаюцца прадстаўнікі бацькоўскіх камітэтаў і прадпрыемстваў, да якіх прымацаваны школы.

Курсы абл'гацый дзярж. пазык

Назва пазык	Купля	Продаж	Справ.
1-я 6 процант. пазыка індустр. 1927 г. за абл. у 25 р.	—	—	25—27
2-я паз. індустр. 1928 г. прац.	—	—	26—14,5
2-я паз. індустр. 1928 г. беспрац.	—	—	25—
3-я паз. індустр. 1929 г. прац. за абл. у 50 р.	—	—	51—79
3-я паз. індустр. 1929 г. беспрац. за абл. у 50 р.	—	—	50—54
Пазыка умацн. сялян.-гаспадар. за абл. 10 р.	—	—	10—22
Беспрац. выйгрыш. пазыка 1926 г. за абл. 100 р.	126—50	128 50	—
Беспрац. выйгрыш. пазыка 1929 г. за абл. 100 р.	101—90	102—70	—
10-проц. выйгрыш. пазыка 1927 г. за абл. у 25 р.	25—87	—	—
3-я сялян. пазыка 1927 г. за абл. у 5 р.	—	—	—
12-процэнт. пазыка 1927 г. за абл. у 100 р.	—	—	—
11 проц. унутр. пазыка 1928 г. за абл. у 100 р.	103—03	103—13	—
1-ая 6-прац. выйгр. паз. 1922 г. за абл. у 5 р.	4—84,5	—	—
Моссавет	25—25	25—35	—
9-прац. выйгр. паз. 1930 г.	51—64	51—84	—

Час. вык. аб. адк. рэдактара **Ул. Дуброўскі**

Пленум акрвыканкому адкладваецца

Прызначаны на 18-га чэрвеня пленум акрвыканкому адкладваецца. Аб дню скліканьня будзе паведамлена дадаткова.

Нарада рабкораў 2-га раёну

Сёньня, 9-га чэрвэня, а 7-й гадз. увечары, у клюбе «Парыскае камуны» (малая саля) склікаецца нарада рабкораў рэдкалегій насьценных і друкаваных газэт, сэктараў ячэек па масавай рабоце і мабілізаваных таварышоў па прав'ядзеньню падрыхтоўкі да зьездаў.

Нарада склікаецца па пытаньням: 1) Аб папулярызацыі і выкананьні пастановы бюро ЦК КП(б)Б па агляду работы раённай арганізацыі. 2) Аб сацспаборніцтве на лепшую падрыхтоўку да 16-га зьезду і масавай рабоце ў сувязі з падрыхтоўкай да зьезду.

Культпроп 2-га РК КП(б)Б.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР. Гастролі музычн. камэдыі і камопэры пад кіраўніцтвам Л. Г. МІРАЕВА

Сёньня 9 і аўторак 10 чэрвеня, кахан. музк.

„БАЯДЭРКА".

Бялеты прадаюцца ў гарадзкой касе (Вагзальная, 25) з 9—5 гадз. і ў касе тэатру—з 12—2 і ад 5—10 гадз.

ГАРТЭАТР (Канатная вул.) Перасоўны мастацкі яўрэйскі тэатр „Ройтэр факел" пад кіраўніцтвам І. Л. Ракіціна.

Сёньня, 9-га чэрвеня, Я. Гордзін **ЗА АКІЯНАМ** у 4-х дзеях, пастаноўка Л. Бугавай.

Бялеты ў касе тэатра.

ЦЫРК таварыства „Прыхільнікі дзяцей". Толькі шэсьць **ГАСТРОЛЯЙ** Маскоўскага **БАЛЕТНАГА** ансамбля імя **ВЕРЫ МАЙЯ.**

Аўторак, 10-га, серада, 11-га чэрвеня, **першыя дзьве ГАСТРОЛІ.**

Склад ансамблю - **22 чалавека.**

У рэпэртуары—**танцы ўсіх жанраў**

Падрабязнасьці ў афішах.

Адчынена папярэдняя продаж білетаў штодзённа з 12 гадз. дню.

БЕЛДЗЯРЖКІНО 3 панядзелка, 9-га чэрвеня

СПАРТАК Пачатак 1-га сэан. а 6½ г. — Новы амэрыканскі фільм **Насустрэч жыцьцю.**

Мастацкі Пачатак 1-га сэан. а 6 г. 30 хв. — **ПАТ і ПАТАШОН** у новай камэдыі **ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ.**

ПРАЛЕТКІНО Пачатак 1-га сэан. а 6½ г. Кас. адч. з 5 г. — Нямецкі баявік **Дзеля дзяцёнка** (КЛЯТВОПРЕСТУПЛЕНИЕ)

Для сведения всех госкооперативных, строительных организаций и заготовителей дров!

Постановлением Таркома НКПС от 23 го апреля с. г. при перевозках с 1-го мая по 31-е августа алебастра, гипса, извести негашен., мела очищ., балласта, глины строительн., песку обыкн. гравия, известняка, песчанки, бута и щебня—отменено взимание станционного сбора.

При перевозках перечисленных выше грузов с 1 го сентября по 31-е декабря взимание сбора за станционные расходы будет производиться в двойном размере.

Для дров и соли, перевозимых в период с 1-го мая по 31-е августа, Таркомом установлен пониженный тариф со скидкой 10% от общего действующего грузового тарифа.

Об'являя об этом для сведения всех заинтересованных организаций, производящих отгрузку выше названных грузов по станциям 6-го района, управление района обращает внимание на необходимость усиления отгрузок в летний период, учитывая предоставление льгот, направленных к значительному снижению накладных расходов.

6-й эксплоатационный район дирекции МББ ж. д.

1068—5—4

У мэтах разгрузкі апарату Дзяржбанку ад разьлікаў па дробных рахунках, **Віцебскае аддзяленьне Дзяржбанку** просіць гаспадарчыя органы рабіць усе разьлікі па рахунках на суму да 100 руб. з пакупнікамі і спажыўцамі непасрэдна, усямерна дабіваючыся замены наяўных грошай чэкамі на Дзяржбанк.

У адпаведнасьці з гэтым, з моманту апублікаваньня сучаснай аб'явы, Віцебскае аддзяленьне Дзяржбанку спыняе прыём ад кліэнтуры рахункаў на суму да 100 руб. для разьлікаў.

ДЗЯРЖБАНК СССР Віцебскае аддзяленьне.

1074—3—3

ДЗІЦЯЧЫ КІНОТЭАТР у „ПРАЛЕТКІНО" ім. Макса Гельца.

3 панядзелка, 9 чэрвеня, мастацкі фільм **МАЛЫЯ І ВЯЛІКІЯ** Штодзённа толькі 1 сэанс. Пачатак у 5 гадз. КАСА адчынена з 3 гадз.

Колхоз „Новый Свет" (Задуновская площадь № 13) **ПРОДАЕТ: РАССАДУ КАПУСТЫ, БРЮКВЫ И КОРМОВЫЕ БУРАКИ в любом количестве.**

ПРАВЛЕНИЕ. 1059 3—2

На 1-ой Витебской ГОСМЕЛЬНИЦЕ (Городокское шоссе, № 44), **ПРОДАЮТСЯ ОТХОДЫ** от переработки зерна **ДЛЯ КОРМА СКОТА** государственным и кооперативным организациям, а также населению по 32 коп. пуд.

Продажа производится ежедневно от 9 час. утра до 3 час. дня до 1-го июля с. г.

1081—2—2 **Союзхлеб.**

Всем выдвиженцам з-да „Красный металлист"!

Парт-коллектив и завком созывают на 15-е июня, в 4 часа дня, в помещ. клуба завкома, **совещание выдвиженцев.**

Явка обязательна. Проезд за свой счет.

Партколлектив и завком. 1087—1—1

ТРАНСТРОЮ ТРЕБУЕТСЯ легковой автомобиль, три полуторатонных грузовичка и мотоцикл.

С предложениями обращаться по адресу: Витебск, Большевистская 11 (б. Долгоруковская).

КУРСЫ КРОЙКІ І ШЫЦЬЦЯ.

З 8-га па 15-е чэрвеня ў памяшканьні 2-й беларускай школы (Пакроўская, 4, 1-ы раён) адчыняецца **выстаўка** курсаў кройкі і шыцьця.

Выстаўка адчынена з 10-ці гадз. раніцы да 9-ці гадз. увечары.

Уваход вольны.

1084—2—2

По случаю от'езда продаются буфет и мягкая мебель.

Адрес: В.-Набережная ул. д. № 29. **Позин.**

1070 7—3

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакуманты, якія лічыць несапраўднымі

Па гораду

Шофэрск. пасьведч. на права кіраваньня за № 1284 М. А. Саранцова 4325
Пасьведчаньне асабовасьці Ф. Л. Брусаванскай 4328
Даведка аб працы, выд. сматр. будынка 11-га вуч.аддз. пуцей В. М. Пятрусяву 4329
Дзьве мэтрыкі В. і З. Казаковых 4330
Сяброўскі біл. саюзу чыгуначн. за № 71125 І. М. Шупеліна 4331
Парт. білет КП(б)Б за № 1088226 І. М. Шупеліна 4332
Воінская кніжка за № 7173 І. М. Шупеліна 4333
Кніжка дзіцяч. ЦРК А. Ф. Голубева 4334
Кніжка каап. «Змычка» Ф. Р. Лісанава 4335
Сяброўскі білет саюзу мэталістых за № 918908 К. Г. Клепіка 4337
Бюлецень І. С. Юшкевіч 4338
Вайсковы дакумант Е. З. Янчанка 4340
Воінская асабовая кніжка .. Ф. Гушчанка 4341
Мэтрыка А. А. Астроўскага 4342
Вэлёсіпедн. № 203 К. Д. Чыжэўскай 4343
Атэстат аб сканчэньні янавіцк. 7-годкі с характ. В. Н. Якушава 4345
Пасьведчаньне асабовасьці, выд. Халопінск. РВК Н. І. Сіроткіну 4346
Пасьведчаньне асабовасьці І. Ф. Анушчанка 4347
Воінская асабовая кніжка Т. Н. Барсукова 4348
Дзьве дзіцяч. заборн. кніжкі ТПО Р. і Т. Пятровых 4349
Кніжка каап. «Змычка» А. Г. Каваленка 4350
Каап. кніж. «Змычка» А. Л. Архіпоўскага 4351
Кніжка каап. «Селянін» С. М. Раброва 4352
Сябр. білет саюзу чыг. № 58327 К. І. Віліма 4353
Вуч. вайсковы білет М. Т. Самажнёва 4354
Сябр. біл. саюзу сельгасраб. № 6959 П. Н. Слухоўскага 4355
Студэнцкі білет вэтінстытуту № 144 П. Н. Слухоўскага 4356
Ваенная кніжка даПрызыўніка П. Н. Слухоўскага 4357

Па вакрузе

Конская картка М. Салодчэнка 1132
Асабов. кн. № 1784 Н. М. Пашкоўскага 1133
Паявая кніжка О. І. Бардылевіч 1134
Асабов. кніжка І. Т. Руколь 1135
Кн. Чашніцк. спаж. т-в № 2586 Л. Таланя 1136
Асабов. картка і конская картка Ф. Н. Шакаліса 1137
Паявая кніжка І. Зарубіцкага 1138
Сяброўск. кніжка А. І. Невельскага 1139
Асабов. картка А. І. Купрэшчанка 1140
Асабов. картка К. Ракіціна 1141
Пасьведчаньне асабовасьці П. Шабліна 1142
Пасьведчаньне асабовасьці Г. Г. Кюсьцюкова 1143
Паявая кніжка Шумілінскага спаж. т-ва № 814 І. Д. Кукшынова 1145
Сяброўскі біл. саюзу будаўнікоў № 10/38688 М. Б. Александровіча 1146
Вучот. кніжка Я. Ф. Шарапіна 1147
Паявая кніжка Смолаўск. спаж. т-ва за № 185 Н. А. Пятрова 1148
Асаб. кніж. дэмаб. чырвонаарм. С. Бодрага 1149
Лясн. дакумэнт В. В. Баражынскага 1150
Паявая кніжка Калышанскага спаж. т-ва С. Я. Несьцерава 1151
Вучот.-конская карт. Лянчэнка 1152
Воінскі дакумэнт В. К. Буйнякова 1153
Кніжка храпавічск. спаж. т-ва № 269 П. Паварэха 1154
Пасьведчаньне аб нягоднасьці к ваен. сл. Н. У. Волкава 1155
Каап. кніжка № 946 Чашніцк. спаж. т-ва П. Н. Сенько 1156
Пасьведчаньне асабовасьці Е. К. Баўта 1157
Сяброўская кніжка саюзу дрэваапрацовачнікаў № 102 І. К. Попялкоўскага 1158
Паявая кніжка Гарадоцкага спажыв. т-ва за № 2877 П. С. Іванькова 1159

Віцгарліт № 1. Друкарня „Камінтэрн", Бальшавіцкая 10.